№ 41 (543) 8 лістапада 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Футбол 1982 году

Тады менскае «Дынама» першы й апошні раз заваявала залатыя мэдалі чэмпіянату СССР. Піша Віталь Тарас. Старонка 14.

### ЗША рыхтуюць новы ціск

Намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр назваў вызваленьне ўсіх палітвязьняў галоўнай умовай нармалізацыі стасункаў.
**Старонка 5.**

### Зубкоўскія манеры

Расея ў аднабаковым парадку выйшла з дамовы аб транзыце нафты і нафтапрадуктаў па магістральных трубаправодах СНД.
**Старонка 5.**

### Чалавек кастрычніка

Чытачы «НН» выбралі інжынэра. **Старонка 2.**

### Затрымалі ўдзельнікаў сьвяткаваньня Хэлоўіну

Моладзь пасадзілі на суткі за маскарадныя касьцюмы.
**Старонка 16.**



### «1612» — стэрэатыпы новае Расеі

Расея ў фільме дзікая, абыякавая, здрадлівая. І нядольная існаваць бяз моцнае ўлады — такая палітычная замова Крамлю.
**Старонка 26.**

## Калі ж той крызіс?




**Сацыяльныя лёзунгі аказаліся менш прывабнымі за эўрапейскія. Апазыцыя працягвае спадзявацца на крызіс. Вынікі «Сацыяльнага маршу» — старонка 8. Правыя палітыкі разыгрываюць антыкамуністычную карту, ставяць пад сумнеў адзінства Дэмакратычных сілаў — старонка 13. На фота: Сяргей Калякін вядзе маніфэстантаў ад Акадэміі Навук на Бангалор.**

АД РЭДАКЦЫІ

# З галавою ў мінулым

На Антыкамуністычным форуме, што сабраўся 4 лістапада ў Менску, — форумам, праўда, гэты сход у вузкім коле, арыентаваны не навонкі, а ўнутар, на саміх сябе, на ўжо навернутых, можна назваць зь вялікай нацяжкай — адзін з удзельнікаў высьцеліў дарогу ў залю сьвежымі нумарамі газэты «Товарищ». Ён прынёс ня «Фолькішэр Бэабахтэр» і ня «Праўду» 1937 году. Нават не партыйны орган — гэта незалежная левая плюралістычная газэта, якую калегі нашаніўцаў выдаюць на свой страх і рызыку, друкуючы за мяжою і перавозячы ў Беларусь. Не знайшлося сярод удзельнікаў форуму разважлівага чалавека, які б спыніў гэтую абразу незалежнай прэсы, які б паставіў сабе пытаньне, чым «мы» лепшыя ад «іх»?

«Наша Ніва» прапануе Беларускай асацыяцыі журналістаў даць маральную ацэнку пэрформансу 4 лістапада.

* * *

У выступах праводзіліся паралелі між камуністычным форумам, што адбываўся ў той самы дзень у гатэлі «Беларусь», і сходам сяброў РСДРП, што адбыўся ў Менску на пачатку стагодзьдзя. Але марксізм мае такое ж дачыненьне да сталінізму, як нацыяналізм — да нацызму.

Удзельнікі Антыкамуністычнага форуму, што сабраўся ў Менску 4 лістапада, атаесамляюць сталінізм з камунізмам. Гэта з навуковага пункту гледжаньня памылкова.

* * *

Самасьцьвярджацца праз таптаньне газэтаў могуць толькі маргінальныя палітыкі, якія ня маюць шанцаў узьняцца над групавымі, партыйнымі граніцамі і стаць сапраўды агульнанацыянальнымі лідэрамі.

* * *

Ідэя пакаяньня камуністаў, папулярная ў пачатку 90-х, сёньня гучыць настолькі ж анахранічна, як і папулярная ў пэўных колах думка, што Пазьняк служыў паліцаем, раз выкарыстоўвае той самы бел-чырвона-белы сьцяг. Няясна, за што мусяць каяцца перад спадаром Р., каторы высьцеліў падлогу «Товарищам», камуніст Сяргей Вазьняк, які штотыдзень, рызыкуючы, возіць сваю газэту з-за мяжы.

* * *

Падобныя форумы ня маюць навуковага, маральнай і палітычнай вартасьці сёньня. Камфортнае змаганьне «між сваімі» не набліжае Беларусі да незалежнасьці і дэмакратыі. Арганізацыя такога форуму была б гераізмам у 1977 годзе і справядлівасьцю ў 1987 годзе, але ў 2007-м ад усяго гэтага патыхала проста піярам. Змаганьне за «голас Мін'юсту» для дэмакратычных палітыкаў, якія прэтэндуюць на праўдзівае лідэрства, недапушчальнае.

Працяг тэмы — **старонка 13**.

# Сталінізм памірае марудна

Камуністы уваходзяць сёньня ва ўрадавыя кааліцыі ў такіх вялікіх дэмакратычных краінах, як Італія, Індыя, Паўднёвая Афрыка. Небагатая Малдова, паводле ўсіх крытэраў, застаецца адной з самых свабодных краінаў СНД. Усе спробы Крамля скінуць камуністычны ўрад Вароніна не далі плёну, і прэзыдэнт-камуніст працягвае адаптваць краіну да эўрасаюзаўскіх стандартаў. Камуністы разам з сацыялістамі і хрысьціянскімі дэмакратамі, зьяднаўшыся, перамаглі Піначэта ў Чылі.

У той жа час камуністы працягваюць недэмакратычна кіраваць Кітаем, Віетнамам і Кубай.

Камуністычныя партыі ёсьць розных колераў і адценьняў. «Камуністычная» форма можа мець розны зьмест. На Філіпінах, дзе таксама працягваецца партызанка, гэтае слова азначае «мааісцкая», а ў Партугаліі, бадай, «антыклерыкальная». А ў Калюмбіі — «наркаанархічная».

Камуністамі былі масон Тарашкевіч і партызан Машэраў, бонза Шамякін і падпольшчык Максім Танк; да марксістаў адносяць сябе Антон Луцкевіч, Лешак Калакоўскі, Тэадор Адорна, Славай Жыжак...

Антыкамуністычны форум 4 лістапада прымусіў нас задумацца над пытаньнямі, на якія няма простых адказаў. Ці быў сталінізм і мааізм непазьбежным вынікам марксізму? А ленінізму? Наколькі камунізм ідэнтычны з марксізмам? Ці ёсьць сталінізм марксізмам? Ці камунізм гэта антыгуманная ідэалёгія? Ці заслугоўвае камунізм Нюрнбэрскага працэсу, ці ягоныя злачынствы былі такімі ж абэрацыямі, як франкізм быў захапленьнем каталіцызму? Ці нясуць усе камуністы адказнасьць за генацыд 30-х ці крывавае вар'яцтва Пал Пота? Якую будучыню маюць камуністычныя партыі і ў чым сэнс левага руху сёньня? Якая візія гісторыі Беларусі можа кансалідаваць нацыю, урэшце?

**Чытайце эсэ Андрэя Дынька ў адным з наступных нумароў газэтаў «Наша Ніва» і «Товарищ».**

### Рэдактары «НН» і «Arche» і Андрэй Хадановіч у Гомелі

**15 лістапада** ў Гомелі — сустрэча з рэдактарам «Arche» Валерам Булгакавым, рэдактарам «Нашай Нівы» Андрэем Скуркам і паэтам Андрэем Хадановічам. Адбудзецца яна **на ўправе АГП (вул.Палеская, 52). Пачатак а 18-й.**

# Алег Лабовіч: Хачу, каб дзеці вырасьлі беларусамі

Пераможцу апытаньня «НН» на званьне Чалавека кастрычніка **Алега Лабовіча** тэлефанаваньне застала ў шпіталі, дзе ён знаходзіцца зь меншым сынам Янкам. Нягледзячы на гэта сп. Алег адказаў на некалькі нашых пытаньняў.

**«Наша Ніва»: Для Вас было прынцыповым, каб сын пайшоў менавіта ў беларускамоўную клясу?**

**Алег Лабовіч:** Безумоўна. Я сам вучыўся ў беларускамоўнай школе. Мне падабаецца наша мова, таму ад самага нараджэньня дзяцей марыў, каб вучыліся толькі па-беларуску. Калі прыйшоў час задумацца пра навучальную ўстанову для сына, то высьветліў, што на роднай мове ў Бярозе нідзе навучацца немагчыма. Пачаў дамагацца свайго. Дабіўся.

**Працяг на старонцы 11.**

# Вуліцаў Вайніловіча, Сапегі і Брыля ў Менску ня будзе

Міністэрства юстыцыі адмяніла рашэньне дэпутатаў на фармальнай падставе. Аднак за гэтым праглядаецца палітычны жэст.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Нягледзячы на адсутнасьць мэтодык, перайменаваньні ў Менску ўсё-такі здараюцца. На фота: зьмена шыльдаў на колішнім праспэкце Францішка Скарыны.**

Верасьнёўскае рашэньне дэпутатаў Менгарсавету аб перайменаваньні вуліцы Берсана ў вуліцу Вайніловіча, а таксама наданьні гарадзкім вуліцам імёнаў Сапегі й Брыля не прайшло прававой экспэртызы ў Міністэрстве юстыцыі.

У менскім гарвыканкаме «Нашай Ніве» паведамілі, што згодна з законам аб мясцовым самакіраваньні падобныя рашэньні мусяць абмяркоўвацца з насельніцтвам, аднак мэтодыка абмеркаваньня на сёньня не распрацаваная. Гэта і сталася фармальнай прычынай, паводле якой рашэньне 5-й сэсіі Менгарсавету ад 26 верасьня не прайшло прававой экспэртызы ў Міністэрстве юстыцыі.

Рашэньне Мін'юсту наконт перайменаваньня вуліцаў у Менску камэнтуе старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» **Алег Трусаў**.

«Гэта голы валюнтарызм. У гісторыі Беларусі гэта першы выпадак, калі Мін'юст умешваецца ў працу народных абраньнікаў у такім пытаньні, як наданьне назваў вуліцаў ці іх перайменаваньне. Што датычыць народнага абмеркаваньня, то наконт вуліцы Янкі Брыля ТБМ сабрала некалькі тысячаў подпісаў з усёй Беларусі. Гэтыя подпісы былі перададзеныя старшыні Менгарвыканкаму Міхаілу Паўлаву. Калі мэтодыка абмеркаваньня на сёньня не распрацаваная, то на якой падставе былі перайменаваныя праспэкты Скарыны і Машэрава? А тыя зьмены правялі, увогуле не спытаўшыся ні чыйго меркаваньня. Узьнікаюць пытаньні наконт вуліцаў Сапегі і Брыля. Плянавалася, што іхнымі імёнамі назавуць новыя вуліцы сталіцы. То ў чым тут праблема? Вядома, што супраць перайменаваньня вуліцы Берсана выступілі камуністы-чыкінцы, але ж і тут афіцыйнай нагодай адмены рашэньня дэпутатаў гарсавету назвалі не пратэсты грамадзкасьці, а адсутнасьць мэтодыкі».

**Чык; Печ**

# Ці рэабілітуе Міклашэвіч Геніюш?

Больш за 70 вядомых асобаў Беларусі падпісалі прадстаўленьне на рэабілітацыю Ларысы Геніюш.



1 лістапада на імя Генэральнага пракурора **Пятра Міклашэвіча** Аргкамітэтам па ўшанаваньні ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, Саюзам беларускіх пісьменьнікаў, РПГА «Беларускі Хэльсынскі Камітэт» было накіраванае прадстаўленьне на рэабілітацыю вядомай беларускай паэткі **Ларысы Геніюш**.

Яго падпісалі акадэмік **Радзім Гарэцкі**, гісторык **Ігар Кузьняцоў**, народны паэт Беларусі **Ніл Гілевіч**, праваабаронцы **Тацяна Працька**, **Гары Паганяйла** і яшчэ 70 вядомых грамадзянаў.

З 1937 г. Ларыса Геніюш жыла ў Чэхаславаччыне, мела грамадзянства гэтай краіны. Аднак у 1948 г. на загад Масквы яна была арыштаваная і дэпартаваная ў СССР, дзе яе асудзілі на 25 гадоў турмы за «дапамогу міжнароднай буржуазіі ў ажыцьцяўленьні варожай дзейнасьці супраць СССР».

Ларыса Геніюш была вызваленая ў 1956 г., аднак несправядлівы прысуд так і ня быў адменены.

Гэта была помста савецкіх уладаў нязломнай паэтцы, што да сьмерці не прыняла савецкага грамадзянства.

Па матывах яе аўтабіяграфічнай кнігі «Споведзь» на кінастудыі «Беларусьфільм» зьнялі мастацкі фільм «Птушкі бяз гнёздаў», паставілі спэктакль «Белы сон». На студыі «Летапіс» зьнялі дакумэнтальны фільм «Вянок цярновы васількоў». У Зэльве каля царквы стаіць помнік ёй. А вось рэабілітацыі дагэтуль не адбылося.

**Люд**

## СЬЦІСЛА

### Узрасьце базавая велічыня

З 1 сьнежня яна складзе 35 тысячаў рублёў (была 31 тыс. рублёў). Адпаведна вырастуць штрафы і выплаты.

### На радзіму Лява Сапегі вярнулася старое Эвангельле

У царкве Сьвятой Тройцы, што знаходзіцца ў Астроўне — на радзіме славутага канцлера Вялікага Княства Літоўскага **Лява Сапегі** — нядаўна адбылася знакавая падзея. Сюды вярнулася Эвангельле, выдадзенае больш за стагодзьдзе таму, у 1896 годзе. Калі ў 1960-я гады храм быў закрыты, кнігу вынесла мясцовая жыхарка **Аляксандра Пятрова**. І вось яе сваячка **Люба Важгурава** вярнула том у храм.

**Яня Ільіна, Народныя навіны Віцебску**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Канцэрт памяці Анатоля Сыса прайшоў 3 лістапада ў Чырвоным касьцёле сталіцы. Вядомыя музыкі выступілі на ім, каб сабраць сродкі на помнік паэту.**
**На фота: сьпявае Кася Камоцкая.**

## СЬЦІСЛА

### Алесь Камоцкі прэзэнтаваў зборнік выбранага

Кніга «Глыбіня дажджу» выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Яна сабрала вершы, тэксты песень, пераклады розных аўтараў.

### «Капітал» Ляпісаў перамог на RAMP 2007

Ролік «Ляпісаў» узяў прыз у намінацыі «Кліп году». Узнагароды прэміі музычнага каналу A1 уручалі ў апошні дзень кастрычніка ў маскоўскім клюбе «Б1 Maximum».

**Буг**

### Памерла паэтка Аўгіньня Кавалюк

Нарадзілася Аўгіньня Кавалюк (Сідаровіч) у Стральцах Скідзельскага раёну. Працавала ў Рызе, а дажывала жыцьцё ў Пецярбургу. Настальгію па Радзіме яна ўмела ператварыць у радасьць успамінаў. Сышла ад нас у 73 гады.

**Мікола Нікалаеў, Санкт-Пецярбург**

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Знакамітая «Гіпіка» па-беларуску

«Гіпіка, альбо Кніга пра коней» — першы ў Рэчы Паспалітай дапаможнік па конегадоўлі і коннай язьдзе. Яе аўтар — вялікі маршалак літоўскі Крыштаф Монвід Дарагастайскі, чый спадчынны маёнтак знаходзіўся ў Мураванай Ашмянцы (сёньня — Ашмянскі раён).

«Гіпіка» складаецца з чатырох частак. У першай распавядаецца пра асновы коннай язды, конскія масьці і прыкметы, падбор і вырошчваньне племяннога маладняку. 2-я частка прысьвечаная пачатковай падрыхтоўцы баявых коней. У 3-й паказаныя ўзоры муштукоў і цугляў. Кніга «Гіпіятрыя» — вэтэрынарны лячэбнік.

**Гіпіка, альбо Кніга пра коней** / Крыштаф Монвід Дарагастайскі; уклад. Сьвятлана Ісчанка, В.Дубоўскі. — Менск, Юніпак, 2007. — 216 с. іл.

Ілюстрацыі знакамітагаТамаша Макоўскага. У анатацыі таксама зазначаецца, што ў кнізе можна знайсьці нямала зьвестак пра побыт шляхты, мэдыцыну, вераваньні і г.д. на пачатку XVII ст.

**Сьвятлана Ісчанка**, што зрабіла асноўную працу па перакладзе і укладаньні, зазначае, што ўпершыню «Гіпіка» выходзіць з камэнтарамі.

Выданьне вялікафарматнае (A4), багата ілюстрацыяў, на крэйдаванай паперы.

**Ул.інф.**

# Крэмэр абяцае новы ціск

Пра гэта намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША ў эўрапейскіх і эўразійскіх справах **Дэвід Крэмэр** паведаміў у часе прэсавай канфэрэнцыі для радыё «Свабода».

Крэмэр: «Я быў у Беларусі сёлета ў красавіку, сустракаўся з намесьніцай кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі **Натальляй Пяткевіч**. Сустрэча адбылася на яе просьбу, не на маю. Я лічыў, што гэта добрая нагода, і я сказаў ёй у ясных тэрмінах, як мы можам палепшыць дачыненьні паміж Беларусьсю і Злучанымі Штатамі. Галоўнай умовай было вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў, ня двух ці трох, хаця мы віталі і гэта, а ўсіх. Мы ім далі сьпіс гэтых вязьняў, каб яны ведалі, пра каго мы гаворым, каб не было няяснасьці.

Я шкадую, што вязьні не былі вызваленыя, наадварот, мы бачылі, што рэжым узмацніў ціск на апазыцыю. У выніку пасьля майго візыту ў красавіку мы вырашылі ўвесьці дадатковыя санкцыі адносна Беларусі, што мы зрабілі зь вялікім шкадаваньнем.

Мы значна пашырылі сьпіс візавых санкцыяў і прыблізна на працягу наступнага тыдня вы пачуеце пра дадатковыя крокі, якія мы зробім. Я ня буду зараз удакладняць, пачакайце да наступнага тыдня.

Лукашэнкаўскі рэжым знаходзіцца пад беспрэцэдэнтным ціскам з усіх бакоў — з боку ЗША, з боку Эўрасаюзу, і, як ні дзіўна, з боку Расеі ў сувязі з падвышанымі цэнамі на энэрганосьбіты. Трэба будзе яшчэ паглядзець, якой будзе сытуацыя на пачатку наступнага году, калі ізноў пойдуць угару цэны, якое ўзьдзеяньне гэта зробіць на рэжым».

# Зубкоўскія манеры

Беларускі бок даведаўся пра аднабаковы выхад Расеі з дамовы аб правядзеньні ўзгодненай палітыкі ў галіне транзыту нафты і нафтапрадуктаў па магістральных трубаправодах СНД постфактум.

Адпаведны загад аб прыпыненьні ўдзелу РФ у дамове быў падпісаны 31 кастрычніка прэм’ер-міністрам Расеі Віктарам Зубковым. Дамова дзейнічала ад 12 красавіка 1996 г. Дакумэнт рэгляментаваў узаемадачыненьні краінаў-пастаўнікоў і транзытных краінаў у сфэры паставак нафты ў Заходнюю Эўропу. Дамова забараняла краінам-транзытарам выкарыстоўваць нафту і нафтапрадукты ў сваіх мэтах. Паводле дамовы, краіны-ўдзельніцы яе ня могуць у аднабаковым парадку прымаць рашэньні, якія б пагоршылі ўмовы транзыту нафты і нафтапрадуктаў. А менавіта такім і бачыцца экспэртам рашэньне аб пабудове другой чаргі Балтыйскай трубаправоднай сыстэмы (БТС-2). Газэта «Белорусы и рынок» прыводзіць словы дырэктара энэргетычных праграмаў украінскага цэнтру «Номас» Міхаіла Ганчара, што выхад Расеі з дамовы прадыктаваны акурат тым, што праект пабудовы БТС-2 мае распачацца ў хуткім часе.

Беларускіх профільных чыноўнікаў не насьцярожыў той факт, што пра рашэньне расейскага ўраду ім паведамілі постфактум. Паводле дамовы, расейцы павінныя былі зрабіць гэта за шэсьць месяцаў. Айчынныя чыноўнікі ўпэўненыя, што пакуль расейскія кампаніі будуць лічыць мэтазгоднай супрацоўніцтва зь Беларусьсю, выхад Расеі з дамовы ніяк не адаб’ецца на пастаўках вуглевадароднай сыравіны ў Беларусь.

Пасол Расеі ў Беларусі Аляксандар Сурыкаў прычынай рашэньня расейскага ўраду назваў жаданьне расейскага бізнэсу і дзяржавы менш залежаць ад эканамічных і палітычных рашэньняў транзытных краінаў.

**Печ**

## СЬЦІСЛА

### Суд над Дашкевічам працягнецца 9 лістапада

6 лістапада ў шклоўскай калёніі мусіў распачацца працэс над Зьмітром Дашкевічам. Аднак суд быў перанесены на 9-га з фармальнай прычыны. Паводле заканадаўства абвінавачаны мусіць атрымаць паведамленьне пра прызначэньне судовага працэсу не пазьней як за 5 сутак да яго пачатку. Зьміцер Дашкевіч даведаўся пра дату паседжаньня 1 лістапада, і на сёньняшнюю раніцу поўных 5 сутак яшчэ не мінула.

**Пан**

### Шэйман перастаў быць памочнікам прэзыдэнта

У складзе Рады бясьпекі Беларусі застаўся адзін памочнік прэзыдэнта ў нацыянальнай бясьпецы — Віктар Лукашэнка. Да выданьня кіраўніком дзяржавы 1 лістапада ўказу №556 памочнікам у дапаўненьне да асноўнай пасады — дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі — афіцыйна быў і Віктар Шэйман.

**БелаПАН**

### Працэс над кадэбістамі, якія зьбілі Ломаця, адкладзены

Працэс перанесьлі на 14 лістапада. Прычына — хадайніцтва пацярпелага, Зянона Ломаця. Працэс пройдзе за зачыненымі дзьвярыма. Прозьвішчаў абвінавачаных у Вярхоўным Судзе не называюць.

**Буг**

# Кантракты з Кітаем і Карэяй на $650 млн

Кітай пракрэдытуе вытворчасьць цэмэнту, ад карэйцаў Беларусь хоча легкавікі.

Гэты тыдзень стаў багатым у двухбаковых дачыненьнях Беларусі з буйнымі азіяцкімі краінамі: у Менск наведаўся прэм’ер Дзяржрады Кітайскай Народнай Рэспублікі Вэнь Цзябао, а беларускі прэм’ер-міністар Сяргей Сідорскі накіраваўся ў Паўднёвую Карэю.

У ходзе візыту кітайскага прэм’ера былі падпісаныя двухбаковыя дакумэнты на суму больш за $530 млн. У іх ліку найбольшую цікавасьць выклікаюць міжурадавыя рамачныя пагадненьні аб выдзяленьні Кітаем пакупніцкага крэдыту ў аб’ёме $500 млн на закупку трох лініяў па вытворчасьці цэмэнту, а таксама льготнага крэдыту на суму $27 млн. У зьвязку з даўнімі чуткамі наконт выкарыстаньня беларускімі ўладамі кітайскага абсталяваньня для кантролю за інтэрнэтам, пікантным выглядае заключэньне кантракту на пастаўку абсталяваньня паміж кампаніямі «Хуавэй» і «Белтэлекам».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Прэм’ер Дзяржрады КНР Вэнь Цзябао на плошчы Перамогі.

Прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі правёў перамовы з карэйскімі кампаніямі, што маюць намер удзельнічаць у рэканструкцыі нафтахімічнай вытворчасьці, у прыватнасьці, у праекце па вытворчасьці параксілолу. Прыкладны кошт праекту — $126 млн.

Паводле словаў С.Сідорскага, вялікі патэнцыял мае супрацоўніцтва ў галіне вытворчасьці электроннай бытавой тэхнікі, мэдыцынскага абсталяваньня.

У якасьці прыкладу супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сфэры ён прывёў пастаўкі ў Карэю паўправаднікоў, што вырабляюцца беларускім НВА «Інтэграл».

Акрамя таго, бакі разгледзелі магчымасьць вытворчасьці ў Беларусі карэйскіх аўто Hyundai.

**Сямён Печанко**

# На броварах зьмяняецца кіраўніцтва

На пасадзе гендырэктара ААТ «Піўзавод «Аліварыя» Мікалая Дудко, што ў сьнежні сыходзіць у адстаўку, можа зьмяніць кіраўнік ЗП «Кока-Кола Бэврыджыз Беларусь» Аляксандар Дзянісаў.

Гэта ня першая гучная кадравая зьмена ў піваварнай галіне Беларусі. Пры канцы кастрычніка старшыня назіральнай рады піваварнай кампаніі «Сябар» Сяргей Левін таксама паведаміў пра сыход з пасады да пачатку наступнага году. Абвяшчаючы пра сыход з пасадаў, кіраўнікі абедзьвюх кампаніяў казалі пра пераход да больш маштабных праектаў, ды выказвалі ўпэўненасьць у далейшых пэрспэктывах разьвіцьця іхных прадпрыемстваў.

Так, у часе васьмігадовага кіраваньня М. Дудко стратэгічнымі інвэстарамі «Аліварыі» сталі Эўрапэйскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця і міжнародны холдынг BBH.

Выступаючы перад назіральнай радай півварні, імаверны кандыдат на пасаду кіраўніка кампаніі Аляксандар Дзянісаў зазначыў, што «Аліварыя» мае ўсе шанцы стаць нацыянальным гонарам Беларусі.

**Печ**

# Міністэрства фінансаў фіксуе прафіцыт бюджэту

Паводле Міністэрства фінансаў Беларусі, рэспубліканскі бюджэт за студзень—верасень гэтага году выкананы з прафіцытам у памеры 2,398 трлн руб., ці 3,5% ад ВУП. Тэмпы паступленьня прыбыткаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і інавацыйных фондаў апярэджваюць тэмпы выдаткоўваньня сродкаў на іх рэалізацыю.

# Падзеньне цэнаў нерухомасьці ў Польшчы

Упершыню за апошнія гады ў верасьні ў Польшчы ва ўсіх вялікіх гарадах цана кв. мэтра жытла зьнізілася. Пайшлі ўніз і курсы акцыяў дэвэлапэрскіх фірмаў. Падзеньне прадказвалася даўно, бо рэзкі рост прывёў, як і ў Беларусі, да зьмяншэньня колькасьці ўгодаў. Перадусім патаньнелі кватэры ў старых дамах. Хоць падзеньне склала меней за 1%, экспэрты бачаць у ім тэндэнцыю. На іхную думку, цэны спыняць свой рост да 2009 году, а прыбытковасьць дэвэлапэрскіх кампаніяў ужо прайшла свой пік і ніколі ня вернецца да ранейшых паказчыкаў.

**Печ**

# У Пакістане надзвычайнае становішча

Прэзыдэнт Пакістану генэрал Первэз Мушараф **(на фота)** абвясьціў надзвычайнае становішча. Афіцыйная прычына — тэрарысты пагражаюць уладзе яго ўраду, Пакістан у «небясьпечным стане», сувэрэнітэт пад пагрозай.



Крытыкі Мушарафа зазначаюць, што так ён можа адмяніць выбары і абмежаваць свабоду апанэнтаў. Жаўнеры атачылі дамы былога прэм'ер-міністра Бэназір Бхута і Імрана Хана, апазыцыянэра, які знаходзіцца пад хатнім арыштам.

Ўсе гэтыя крокі ішлі за сэрыяй атак шахідаў Аль-Кайды і Талібану. Раней яны былі абмежаваныя племяннымі раёнамі на мяжы з Аўганістанам. Цяпер даладзіся і атакі ў вялікіх гарадах, у тым ліку выбух аўтобуса ў Карачы ў кастрычніку, падчас якіх загінула 145 чалавек.

Але «надзвычайнае становішча» пачалося за тры дні перад тым, як Вярхоўны Суд мог абвергнуць перавыбраньне Мушарафа на пост прэзыдэнта. Апазыцыя ў гэтым бачыць рэальную прычыну.

У Пакістане пачаліся арышты ў розных гарадах краіны. Арыштаваныя прадстаўнікі апазыцыйнага крыла партыі Мусульманская ліга Пакістану, лідэры некалькіх пуштунскіх нацыяналістычных арганізацыяў і ісламісцкіх партыяў.

Дзяржаўныя тэлеканалы з раніцы паказваюць музычныя праграмы і канцэрты народнай музыкі.

**Яраслаў Сьцешык паводле замежнае прэсы**

# Польшча фармуе ўрад

Урад Яраслава Качыньскага падаў у адстаўку. У Канцылярыі прэзыдэнта паведамілі, што лідэр лібэральнае Грамадзянскае плятформы (ГП) Дональд Туск яшчэ на гэтым тыдні будзе прызначаны на пасаду прэм'ер-міністра краіны. Лібэралы фармуюць урадавую кааліцыю зь Сялянскай партыяй.

Маршалкам Сойму быў абраны Браніслаў Камароўскі (ГП), а Сэнату — Багдан Барусэвіч, які наконадні выбараў перайшоў ад кансэрватараў да лібэралаў.

Кандыдатура сэнатара Зьбігнева Рамашэўскага на віцэ-маршалка Сэнату (гэтую пасаду традыцыйна займае прадстаўнік апазыцыі) выклікала супраціў большасьці. На думку ГП, Рамашэўскі быў занадта староньні ў часе папярэдняй кадэнцыі парляманту. «Закон і справядлівасьць» трымаецца гэтай кандыдатуры. На думку дэпутата Кшыштафа Путры, Рамашэўскі як мала хто заслужыўся для польскай дэмакратыі. Яго часам называюць маральным аўтарытэтам сучаснай Польшчы, бо ён быў сярод заснавальнікаў польскай апазыцыі ў сярдзіне 1970-х.



**Зьбігнеў Рамашэўскі.**

Гэтая спрэчка вакол Рамашэўскага адметная для беларусаў таму, што дачка пана Рамашэўскага, Агнешка, узначальвае «Белсат» — першы беларускамоўны тэлеканал, які мае пачаць вяшчаньне ад 10 сьнежня.

**Мікола Бугай**

### Беларусы Масквы ўшанавалі памяць ахвяраў камунізму

На Дзяды прадстаўнікі беларускай дыяспары Масквы ўсклалі кветкі да Салавецкага камня — мэмарыялу ахвярам бальшавізму. Салавецкі камень разьмяшчаецца на Лубянскай плошчы, насупраць будынку былога КДБ СССР і сучаснай ФСБ.

**Алесь Чайчыц**

# Чэхі судзяць сталінскіх пракурораў

Камуністычны пракурор, што спрычынілася да вынясеньня сьмяротнага выраку актывістцы антыкамуністычнага руху Міладзе Гараковай **(на фота)**, атрымала восем год зьняволеньня.

Былога пракурора Людмілу Бразову-Паляднову, што ўжо на пэнсіі і што была вінаватая ў вынясеньні сьмяротнага выраку некалькім асобам, у тым ліку і Міладзе Гараковай, судзілі ў Празе. Праз стан здароўя 86-гадовая падсудная не патрапіла за краты. «Вырак — гэта дасягненьне маральнай справядлівасьці», — сказаў судзьдзя Пётар Браўн. Падчас паседжаньня суду ён заявіў: «Пракурор выдатна ведала, што вырак яе падсудным вынесьлі яшчэ перад судом, а сам працэс служыў адной мэце — прадэманстраваць, што ў краіне права цалкам падкантрольнае. І яна мусіла ўсьведамляць, што ўдзельнічае ў судовым забойстве». Суд таксама падкрэсьліў, што пракурор Бразова-Паляднова мусіла зрабіць усё, каб высьветліць праўду.

Мілада Гаракава была дэпутаткай чэскага парляманту ад нацыяналістычнае партыі, што адмовілася ад дэпутацкае пасады ў знак пратэсту супраць камуністычнага перавароту ў 1948 годзе. Неўзабаве яе засудзілі да шыбеніцы на сфабрыкаваным працэсе, разам зь яшчэ 12 «змоўшчыкамі».

Нягледзячы на бесчалавечныя зьдзекі, сьмелая жанчына не абгаварыла сябе ў часе сьледзтва. Яна не скарылася і сама бараніла сябе на працэсе. Гаракава да таго ўдзельнічала ў антынацысцкім падпольлі, была асуджаная нацыстамі на сьмерць, і прайшла праз нямецкі канцлягер.



**Нат**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Хто браў удзел у Маршы? Вось хто.**

# Калі ж той крызіс?

Сацыяльныя лёзунгі аказаліся менш прывабнымі за эўрапейскія. Апазыцыя працягвае спадзявацца на крызіс. Вынікі «Сацыяльнага маршу».

Напярэдадні «Сацыяльнага маршу» чакалася, што акцыя будзе мець некалькі эпіцэнтраў. Частка людзей мусіла сабрацца у 12.00 ля Акадэміі навук і прайсьці шэсьцем да парку Дружбы народаў, як і было дазволена гарадзкімі ўладамі. Іншая частка, у асноўным моладзь, мелася сабрацца у 14.00 на Кастрычніцкай.

А 12-й ля Акадэміі стаяла чалавек трыста. У асноўным гэта былі камуністы-пэнсіянэры з чырвонымі савецкімі сьцягамі. Трошку менш было бел-чырвона-белых сьцягоў, а таксама штандараў анархістаў. Нейкія знаёмыя генэрала Валерыя Фралова разгарнулі пяць расейскіх сьцягоў. Наўзбоч трымаліся сябры незарэгістраванай ультраправай арганізацыі «Белая воля».

Удзельнікі трымалі расьцяжкі: «Нет — нарушениям прав людей труда», «Нет — платной медицине», «За солидарность трудящихся в борьбе», «Нет — росту цен», «Не — прымусовым кантрактам».

Адна бабулька выйшла на акцыю з рондалем, па якім увесь час біла шумоўкай. Іншы дзядуля са значкам Пагоні на пінжаку ўшчуваў сваіх аднагодкаў за расейскамоўныя лёзунгі.

Увесь час на пляцоўцы духавы аркестар граў жыцьцесьцьвярджальную музыку. Зьявілася некалькі чалавек зь дзяржаўнымі чырвона-зялёнымі сьцягамі, іх ніхто не чапаў. Праз нейкі час падышлі партыйныя лідэры — Сяргей Калякін, Віктар Івашкевіч, Мікола Статкевіч, Аляксандар Бухвостаў, Алена Скрыган. Залуналі сьцягі АГП. Найбольш актыўна ля Акадэміі навук сябе паводзілі анархісты, якія ляпалі ў бубны, а таксама гукалі: «Государство — урод, нет отмене льгот». Калі ня браць у разьлік некалькіх патрулёў ДАІ, то міліцыі зусім не назіралася.

Пасьля невялікага выступу лідэра ПКБ Сяргея Калякіна, калёна рушыла ў бок вуліцы Сурганава. Людзей значна паболела, іх ужо было за тысячу. Калёна выглядала на дзіва стракатай — бел-чырвона-белыя, савецкія, чырвона-зялёныя, анархісцкія сьцягі, штандары АГП, Партыі БНФ, «Маладога фронту», сацыял-дэмакратаў, незалежных прафсаюзаў, «Белай волі». Хто толькі ні браў удзел у дазволеным шэсьці! Некаторыя думалі, што частка моладзі можа адкалоцца і пайсьці да Нацыянальнай бібліятэкі, але ўсе дружна зьвярнулі на Бангалор.

Наперадзе калёны ішлі анархісты. Амаль адразу за імі прыстроіліся падазроныя маладыя людзі зь «Белай волі» з закрытымі тварамі. Яны былі апранутыя ў чорныя скуранкі, берцы і капюшоны. Хлопцы на дзіва добра шыхтаваліся і трымаліся выключна сваёй групай. Час ад часу падымаючы рукі ўгору і гукаючы «Слава нацыі»!

Недалёка ад перасячэньня з вуліцай Якуба Коласа анархісты пачалі гукаць: «Не — фашызму». Гэта і справакавала бойку. Невядома адкуль у хлапцоў у руках зьявіліся палкі, якія пайшлі ў ход. Добра, што на Сурганава не было друзу, як

падчас сёлетняга «Чарнобыльскага шляху», інакш усё магло скончыцца больш сумнымі наступствамі, адзначалі прысутныя. «Белаволеўцы» выхоплівалі чырвона-чорныя анархісцкія сьцягі па якіх дэманстратыўна тапталіся. Потым яны пачалі гукаць «Зіг»!

Адразу пасьля бойкі да дэманстрантаў зьявіліся амапаўцы, таксама пад'ехалі пару аўтазакаў. Байцы, праўда, ня ўмешваліся ў тое, што адбывалася. Не ўмяшаліся нават каля ўнівэрсаму «Рыга», дзе бойка ледзь не аднавілася. Некаторыя прысутныя пазнавалі ў хлопцах зь «Белай волі» футбольных фанатаў. Да Бангалору яны так і не дайшлі, зьнікшы ў дварах. Як высьветлілася, ніякай дружыны апазыцыі, пра якую казаў лідэр ПБНФ Вінцук Вячорка пасьля «Эўрапейскага маршу», на акцыі не было.

Асаблівага імпэту мітынг у парку Дружбы народаў не выклікаў. Грала музыка: ад «Інтэрнацыяналу» да NRM. На мітынгу засталіся толькі самыя трывалыя, хто не спалохаўся холаду і не разьехаўся па дамах — усяго чалавек 300. Сяргей Калякін у сваім выступе адзначыў, што сацыяльны пратэст у Беларусі будзе ўзмацняцца. Некаторыя ўдзельнікі акцыі меркавалі, што арганізатарам Маршу варта было дачакацца моманту, калі прыйдуць новыя «жыроўкі» за кватэру.

Прыкладна ў той самы час, калі скончылася акцыя на Бангалоры, каля сотні чалавек прыйшлі на Кастрычніцкую. Сярод мітынгоўцаў былі заўважаныя Віктар Івашкевіч, Анатоль Лябедзька, прадстаўнікі «Маладых дэмакратаў». Ігар Рынкевіч прыйшоў на Каст-

Працяг на старонцы 10.

**У дазволеным шэсьці бралі ўдзел прадстаўнікі розных палітычных сілаў.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## КАМЭНТАРЫ

## Малалікасьць «Сацыяльнага маршу» падарве ўплыў Калякіна

Мяркуе журналіст **Віталь Цыганкоў.**

Як Марш зьменіць расстаноўку сілаў у апазыцыі, як паўплывае на дачыненьні паміж апазыцыйнымі лідэрамі? Безумоўна, кардынальна не паўплывае, але пэўны псыхалягічны ўплыў будзе. Сёньняшняя акцыя была значна больш малалікай, чым «Эўрапейскі марш». Левым не ўдалося вывесьці ні інвалідаў, ні прадпрымальнікаў, ні іншыя масавыя катэгорыі незадаволеных.

Яшчэ з часоў другога Кангрэсу дэмакратычных сілаў ня раз гаварылася, што на нефармальнае лідэрства ў Радзе дэмакратычных сілаў прэтэндуюць камуністы і пэрсанальна Сяргей Калякін. Гаварылі гэта людзі з БНФ і іншых дэмакратычных сілаў, і гаварылі з пэўнай доляй рэўнасьці. Магчыма, што пры далейшых спрэчных момантах, а яны, безумоўна, будуць у апазыцыйных колах, калі ня ўголас, то негалосна будзе выказаны аргумэнт: «А што вы, левыя, можаце? Колькі ў вас штыхоў?» Як у вядомым анэкдоце, «асадак застанецца», і на аўтарытэт камуністаў сёньняшняя акцыя паўплывае.

**Паводле «Праскі акцэнт», радыё «Свабода»**

## У Беларусі няма перадумоваў для зьменаў

Вынікі «Сацыяльнага маршу» камэнтуе эканаміст **Аляксандар Чубрык.**

Калі прыгадваць Леніна, варта прыгадаць сфармуляваныя ім тры ўмовы рэвалюцыйнай сытуацыі: «вярхі ня могуць кіраваць па-старому», «нізы ня могуць жыць па-старому», і наяўнасьць палітычнай сілы, якая гатовая ўзяць уладу. У Беларусі нічога такога не назіраецца. Улады як маглі кіраваць, так і могуць. Людзі даволі нармальна жывуць. З такім узроўнем даходаў нават пры скасаваньні ільготаў ніхто на вуліцу ня пойдзе. Ну і апазыцыя ўзяць уладу ў свае рукі таксама не гатовая.

Мне нядаўна давялося размаўляць з дакладчыкам па Беларусі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Андрэа Рыгоні. На ягоную думку, беларускае грамадзтва пайшло значна далей за апазыцыю. Тут гэта нават не віна апазыцыі, так сытуацыя склалася, яна складалася доўга, яны гадоў 10 ішлі да гэтай сытуацыі.

І другое, што ён казаў, — што апазыцыя прыкрывае свае слабасьці наяўнасьцю ў краіне рэпрэсіўнага рэжыму. Так, такое ёсьць, але безвыніковасьць дзеяньняў апазыцыі тлумачыцца ня толькі гэтым. Як эканаміст я магу сказаць, што цяпер не існуе эканамічных перадумоваў для палітычных і сацыяльных зьменаў. Магчыма, яны зьявяцца праз 5 гадоў. Але наўрад ці нашмат раней».

**Паводле «Праскі акцэнт», радыё «Свабода»**

# Калі ж той крызіс?

Працяг са старонкі 9.

рычніцкую плошчу з рыдлёўкай. Гэты сымбалічны падарунак, на думку Рынкевіча, мусіць паказаць арганізатарам «Сацыяльнага маршу», што трэба капаць глыбей: і ў апазыцыйным коле, і ў працы з насельніцтвам, бо калі не капаць, сацыяльныя маршы й надалей зьбірацьмуць усяго тысячу чалавек. А вынікам добрага капаньня мусіць стаць зьмена ўлады.

Пасьля калёна накіравалася ў бок плошчы Незалежнасьці. Міліцыі зноў не было. Пад помнікам Леніну нават удалося правесьці вялікі мітынг. Без затрыманых.

Назаўтра заяўнікі «Сацыяльнага маршу» падсумавалі яго вынікі. Інцыдэнт з бойкай між праварадыкальнай «Белай воляй» і анархістамі намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч ацаніў так: «Гэта маргінальныя групы, якія ня могуць вызначыць сваё месца на палітычнай арэне краіны. Усе гэтыя мілітарысцкія групы знаходзяцца пад каўпаком КДБ. Спэцслужбы выкарыстоўваюць іх у мэтах правакацыяў. І гэта будзе працягвацца да той пары, пакуль хлопцы не займеюць ясную і адкрытую пазыцыю. Ва ўчорашняй бойцы ўдзельнічалі несур'ёзныя анархісты і фашысты. Да сур'ёзных ім яшчэ расьці і расьці», — зазначыў В. Івашкевіч.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сябры «Белай волі», якія ўчынілі бойку і пазьнікалі.

«У «Белай волі» ніколі не было ілюзій наконт беларускай лібэральна-дэмакратычнай апазыцыі, але на гэты раз нам спадабаўся ідэйны пасыл акцыі. 4 лістапада апазыцыйныя правадыры заклікалі народ прайсьці маршам ня ў гонар «эўрапейскіх каштоўнасьцяў» ці «наладжваньня дыялёгу з уладай», а ў абарону сацыяльных гарантый», — гаворыцца ў панядзелкавай заяве гэтай незарэгістраванай арганізацыі.

Старшыня аргкамітэту Валеры Ўхналёў сказаў, што Марш атрымаўся і яго мэты былі дасягнутыя. «Акцыя прайшла спакойна і мірна, калі не лічыць чыста правакацыйных дзеяньняў з боку моладзевых радыкальных арганізацый. На «Сацыяльным маршы» мы ўбачылі сотні новых твараў, шмат хто падыходзіў да мяне і прасіў выступіць на мітынгу. Некаторыя пакідалі нам кантакты. Нашыя ідэі падтрымліваюцца людзьмі. 16 сьнежня мы плянуем правесьці шэраг сацыяльных пікетаў па ўсёй краіне» — зазначыў В.Ухналёў.

**Зьміцер Панкавец**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ігар Рынкевіч пажадаў арганізатарам Маршу «капаць глыбей».

## КАМЭНТАРЫ

## Поўны рондаль эклектыкі

Піша Аляксандар Класкоўскі.

«Сацыяльны марш» паводле маштабу (ня болей за дзьве—тры тысячы ўдзельнікаў) склаў у лепшым выпадку палову «Эўрапейскага».

Аглядальнік газэты «Товарищ» Мікалай Тоўсьцік, зь якім я сустрэўся на акцыі, лічыць, што народ яшчэ не пасьпеў сербануць вялікай лыжкай эканамічных нягодаў. Як зрух калега адзначыў, што гэтым разам на вуліцу выйшаў ужо трохі іншы кантынгент, ня толькі заўсёднікі.

Зрэшты, другі мой суразмоўца, палітоляг Валер Карбалевіч, мяркуе, што новай публікі аказалася няшмат, а вось сталы актыў часткова праігнараваў акцыю, «не палічыўшы яе змаганьнем за каштоўнасьці».

Ва ўсякім разе, відавочна, што мітынг на Бангалоры не натхніў правых і асабліва моладзь. Фактычна яна зладзіла свой маленькі прарыў на плошчу Незалежнасьці, пісьменна скарыстаўшыся прыкрыцьцём дазволенай «даpraslай» акцыі.

Моладзь пад бел-чырвона-белымі штандарамі дапяла да помніка правадыру ўсясьветнага пралетарыяту ды прасьпявала «Магутны Божа» пад вокнамі Сідорскага.

Карацей, такой ідэйнай эклектыкі на менскіх вуліцах даўно не было.

# Чалавек кастрычніка

Складаючы сьпіс прэтэндэнтаў на званьне чалавека кастрычніка, мы сутыкнуліся зь відавочным недахопам яркіх асобаў, учынкі якіх неяк паўплывалі на іншых людзей. Ці гэта не зьвязана з суцэльнай дэгуманізацыяй сусьветных і беларускіх СМІ? Штодня, уключаючы тэлевізар, мы бачым кадры дзясяткаў тэрактаў, перажываем за развод у сям’і францускага прэзыдэнта Сарказі, чытаем пра Бін Ладэна і бітцаўскага маньяка. Разам з тым, мы амаль нічога ня чуем пра людзей, якія ахвяруюць сабой, ратуюць іншых, аддаюць кроў і зьдзяйсьняюць подзьвігі. Гэта СМІ нецікава, і мы мала ведаем такіх людзей.

**Жаночая зборная Беларусі па баскетболе.** Нашы дзяўчаты зрабілі сапраўдны фурор у Эўропе, заняўшы на першынстве кантынэнту прызавое трэцяе месца. Беларускі ехалі ў Італію абсалютнымі дэбютанткамі такіх спаборніцтваў. Тым ня менш, перамогшы па чарзе харватак, сэрбак, італьянак, чэшак і латышак, сталі бронзавымі прызэркамі. Гэта першы мэдаль беларусаў у гульнявых відах спорту за ўсе гады незалежнасьці. У менскім аэрапорце дзяўчат сустракалі як сапраўдных гераінь. Нацыя хоча адчуць сябе камандай.

**Алег Лабовіч.** 31-гадовы інжынэр зь Бярозы дабіўся, каб ягоны сын вучыўся ў беларускамоўнай клясе. Алег Лабовіч заўсёды гэтага хацеў, але са зьдзіўленьнем даведаўся, што ў Бярозе няма такіх клясаў. Сп. Алег скіраваў звароты ў Канстытуцыйны суд і Генэральную пракуратуру, адкуль яны былі пераадрасаваныя ў Міністэрства адукацыі, а ўжо пасьля ў бярозаўскі аддзел адукацыі. 15 бацькоў першаклясьнікаў сярэдняй школы №2 г.Бярозы таксама захацелі, каб іхныя дзеці вучыліся на роднай мове. Прыклад Алега Лабовіча можа натхніць іншых бацькоў па ўсёй краіне, якія б таксама хацелі, каб іхнае дзіця пайшло ў беларускамоўную клясу.

**Зьміцер Жалезьнічэнка.** Студэнт-выдатнік Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Скарыны Зьміцер Жалезьнічэнка працягвае змагацца зь незаконным, як думае ён і ня толькі ён, рашэньнем аб адлічэньні з ВНУ. Штогод зь беларускіх унівэрсытэтаў выганяюць дзясяткі юнакоў, але рэдка хто зь іх наважваецца бараніць свае правы. Сёлета гэта ўжо ня першы выпадак, спачатку быў Юрась Алейнік, цяпер — Зьміцер. Але героем месяцу Зьмітра зрабіла іншая гісторыя. Жалезьнічэнка патрабаваў у ваенкамаце — законнае права, толькі мала хто наважваецца настойваць, — каб усе позвы яму пісалі па-беларуску. Менавіта за гэта ў псыхіятрычнай паліклініцы хлопцу паставілі дыягназ «рэакцыя апазыцыі». Жалезьнічэнка перакананы, што ў любым выпадку даб’ецца праўды.

**Артур Фінькевіч і Зьміцер Дашкевіч.** Гісторыі абодвух хлопцаў вельмі падобныя. І адзін, і другі зараз знаходзяцца ў зьняволеньні паводле палітычных артыкулаў. І на аднаго, і на другога сынхронна завялі новыя крымінальныя справы. Зьміцер Дашкевіч адмовіўся даваць паказаньні супраць сваіх сяброў з «Маладога фронту». За гэта яму пагражае яшчэ паўгоду турмы. Сьледзтва ў справе ўжо скончылася, і яе перадалі ў суд. Артура Фінькевіча пры канцы месяца зьмясьцілі ў магілёўскі сьледчы ізалятар нібыта за парушэньні рэжыму. За гэта Артуру пагражае да трох гадоў турмы. Дашкевіч і Фінькевіч сталі знакамі нашага часу і беларускай палітычнай традыцыі.

**Захар Шыбека.** Гісторык прэзэнтаваў сваё новае выданьне «Минскъ сто гадоў таму». Сам аўтар пра кнігу выказаўся наступным чынам: «Гэта кніга пра старонкі гісторыі нашага гораду, які прайшоў шлях ад шараговага губэрнскага гораду Расейскай імпэрыі да сталіцы незалежнай дзяржавы. Кніга лучыць усіх менчукоў. Яна пра шчасьце і гора, пра жыцьцё, якое віравала тут сто гадоў таму. Асабіста ў мяне чытаньне гэтай кнігі выклікае радасныя і сьветлыя пачуцьці. Спадзяюся, што такія самыя пачуцьці яна выкліча і ў маіх чытачоў».

Жывое абмеркаваньне выклікла ў Рэдакцыі, ці ўключаць у сьпіс прэтэндэнтаў на тытул Чалавека кастрычніка Віктара Івашкевіча, Аляксандра Лукашэнку ці Дзяніса Дзянісава, якія былі найбольш актыўнымі ньюсмэйкерамі месяца. Некаторыя сябры Рэдакцыі былі за гэта, але ўрэшце было вырашана, што не.

**Зьміцер Панкавец**

## Алег Лабовіч: Хачу, каб дзеці вырасьлі беларусамі



**Працяг са старонкі 2.**

**«НН»: Чакалі, што ўсё складзецца досыць лёгка?**

**АЛ:** Абсалютна не чакаў. Думаў, што ўсё будзе нашмат цяжэй. Быў гатовы ісьці на доўгатэрміновую барацьбу. Зьбіраўся нават падаваць у суд, наймаць адвакатаў, каб адстаяць свае правы. Я хачу, каб мае дзеці вырасьлі сапраўднымі беларусамі. Любілі і паважалі мову, ведалі гісторыю. Беларускай адукацыі буду дабівацца і для меншага дзіцяці. Ёсьць праблема, што настаўнікі, якія самі ў жыцьці не карыстаюцца беларускай мовай, ня змогуць даць добрай адукацыі нашым дзецям, але я гэтага не баюся. Нешта дадуць настаўнікі, нешта — я сам. Галоўнае, што створаны прэцэдэнт.

**«НН»: Дзе яшчэ беларускамоўныя могуць адстаяць свае правы?**

**АЛ:** Мне цяжка казаць пра нейкія канкрэтныя прыклады. Мне падаецца, што галоўнае, каб была зацікаўленасьць і жаданьне, у такім выпадку можна дамагчыся ўсяго.

**Запісаў ЗП**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Хто, па-Вашаму, можа лічыцца чалавекам кастрычніка?**

| | |
|---|---|
| Жаночая зборная Беларусі па баскетболе | 83 (11.2%) |
| Алег Лабовіч | 273 (36.9%) |
| Зьміцер Жалезьнічэнка | 45 (6.1%) |
| Артур Фінькевіч і Зьміцер Дашкевіч | 270 (36.5%) |
| Захар Шыбека | 69 (9.3%) |

Усяго прагаласавала: 740



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## 29 кастрычніка

### Мірон Дзядам

Бел–чырвона–белы сьцяг зьявіўся а 10–й вечару ў Віцебску над домам №25 па вуліцы Максіма Горкага. Паводле **Барыса Хамайды**, да сьцягу была прымацаваная цыдулка са словамі «З павагай да нашых Дзядоў. Мірон». Праз паўгадзіны сьцяг зьнялі супрацоўнікі Першамайскага РУУС.

### Таямнічае зьбіцьцё

Сябра КХП–БНФ **Ян Дзяржаўцаў** паведаміў, што ўвечары 29 кастрычніка ягонага 18–гадовага сына зьбілі двое невядомых. Сп. Дзяржаўцаў мяркуе, што напад на сына маглі зрабіць тыя, хто ў жніўні гэтага году даслаў яму ліст з пагрозамі ад імя Віцебскай філіі незарэгістраванай арганізацыі **РНЕ**.

## 30 кастрычніка

### Арыштавалі ўлёткі

Актывіст Партыі БНФ **Вацлаў Арэшка** быў затрыманы і адвезены ў РУУС Цэнтральнага раёну з улёткамі пра «Сацыяльны марш». Сп. Арэшку адпусьцілі, пакінуўшы ўлёткі ў пастарунку для экспэртызы.

### Аштрафавалі за Дзяды

Ля Віцебску міліцыянты затрымалі 25 удзельнікаў ушанаваньня памяці продкаў. Імпрэза праходзіла з ініцыятывы КХП–БНФ на ўзьлеску каля вёскі Паляі. У часе акцыі быў усталяваны мэмарыяльны крыж, прысутныя прасьпявалі гімн «Магутны Божа». Міліцыянты на чале з маёрам **Аляксандрам Ліленкам** кваліфікавалі акцыю як «несанкцыянаваны мітынг». Усіх прысутных на аўтобусе, якім яны прыехалі ў Паляі, міліцыянты змусілі паехаць у РУУС Віцебскага раёну.

Пазьней суд Віцебскага раёну прызнаў **Барыса Хамайду**, **Яна Талпыгу**, **Сяргея Белязеку**, **Зьмітра Якаўлева** і **Сяргея Каваленку** за арганізатараў акцыі. З. Якаўлеў быў пакараны штрафам на 1 б.в. (31 тыс. руб.), астатнія атрымалі па 20 б.в. (620 тыс. руб.). Прысуд вынесла судзьдзя **Алена Церахава.**

## 31 кастрычніка

### Фінькевіча азнаёмілі з новым абвінавачваньнем

**Артуру Фінькевічу** афіцыйна прад'явілі новае абвінавачваньне. Сьледчы **Аляксандар Лескавец** у прысутнасьці адвакаткі абвесьціў, што сьледчыя дзеяньні скончаныя і ёсьць доказы віны. Маладафронтаўца вінавацяць у парушэньні арт. 415 КК РБ «Адмова ад адбываньня пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі». Палітвязьню пагражае пазбаўленьне волі тэрмінам ад 6 месяцаў да 3 гадоў з адбываньнем пакараньня ў калёніі агульнага рэжыму. Вясной 2006 г. А. Фінькевіча пакаралі 2 гадамі «хіміі» за палітычныя графіці. Выйсьці на волю хлопец мусіў ужо праз месяц.

### Тацяна Клімава ня мае вестак

Жонка палітвязьня **Андрэя Клімава Тацяна** заявіла журналістам, што апошні тыдзень яна ня можа атрымаць лістоў ад мужа і ня ведае, ці даходзяць яе пасланьні. У Мазырскай калёніі ёй паведамілі, што Клімаў амаль штодня накіроўвае лісты дамоў, але дзіўным чынам яны да яе не трапляюць. Два тыдні таму Клімаў напісаў жонцы літаральна наступнае: «Я трапіў у пекла. Мне застаецца дажыць да панядзелка, каб убачыць пекла ва ўсёй яго велічы». Нагадаем, што А.Клімаў быў асуджаны да 2 гадоў зьняволеньня за артыкул у інтэрнэце, у якім бэсьціў А. Лукашэнку кепскімі словамі.

### Скралі крыж

Старшыня Гарадоцкай раённай арганізацыі Партыі БНФ **Леанід Аўтухоў** паведаміў, што невядомыя скралі мэмарыяльны крыж, зроблены і ўсталяваны ім на ўласныя сродкі ў памяць загінулых на Гарадоччыне ўдзельнікаў антыбальшавіцкага паўстаньня 1918 г. Сп. Аўтухоў зьвярнуўся з заявай у міліцыю. Паводле ягоных словаў, начальнік РУУС спачатку адмаўляўся прымаць заяву і нават пагражаў аштрафаваць Л. Аўтухова «за самавольнае ўстанаўленьне крыжа». Заяву прынялі толькі тады, калі актывіст паабяцаў паскардзіцца ў пракуратуру.

## 1 лістапада

### ТБШ папярэдзілі

Міністэрства юстыцыі вынесла пісьмовае папярэджаньне ГА **«Таварыства беларускай школы»**. Падставай стала правядзеньне выставы ў памяшканьні гарадзенскай структуры ТБШ, прысьвечанай дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт». Паводле Мін'юсту, такім чынам «ТБШ» спрыяе дзейнасьці забароненай арганізацыі.

### Затрыманьні перад «Сацыяльным маршам»

Аднаго з заяўнікаў «Сацыяльнага маршу», намесьніка старшыні «Маладых дэмакратаў» **Міхаіла Пашкевіча** затрымалі ў мэтро, калі той разам са сваім сябрам **Зьмітром Кавалгіным** распаўсюджваў агітацыйныя матэрыялы да акцыі 4 лістапада. Пасьля затрыманьня іх адвезьлі ў УУС мэтрапалітэну. **(На фота: М.Пашкевіч (першы) падчас прэс-канфэрэнцыі напярэдадні «Сацыяльнага маршу»).**

На станцыі мэтро «Трактарны завод» былі затрыманыя **Сяржук Клюеў** і **Мікола Сяргеенка**. Яны раздавалі інфармацыйныя матэрыялы да «Маршу». Усіх затрыманых абвінавацілі ў парушэньні арт. 23.34 АК «Парушэньне парадку правядзеньня масавых акцый».

**СП**

# Антыкамуністычны форум у дзень камуністычнага зьлёту

Правыя палітыкі разыгрываюць антыкамуністычную карту, ставяць пад сумнеў адзінства Дэмакратычных сілаў.

У суботу ў Менску прайшоў антыкамуністычны форум «У будучыню без камунізму». Управа Партыі БНФ, канечне, не палац культуры МАЗ, дзе арганізатарам было адмоўлена ў памяшканьні, але і тут зь лёгкасьцю зьмясьцілася каля сотні антыкамуністаў, сярод іх Севярынец і Лябедзька.

Перад пачаткам грала музыка з «Народнага альбому» і песьні Сокалава-Воюша. Над сцэнай вісела эмблема форуму, на якой чалавечак выкідваў у сьметніцу герб зь серпам і молатам. Дэлегатам раздавалі ўлёткі з параўнальным аналізам нацызму і сталінізму. Адзін з найбольш антыкамуністычна настроеных удзельнікаў мерапрыемства выслаў дарогу ў галоўную залю сьвежым нумарам левай газэты «Товарищ».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Праца форуму пачалася з выкананьня гімну «Магутны Божа», а таксама аўдызапісам колішняга выступу Васіля Быкава пра ахвяраў камуністычнага рэжыму.

Першым прамаўляць на форуме пачаў намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч. «У гэты самы момант у гатэлі «Беларусь» пачынаецца камуністычны зьезд, які ладзіць беларуская ўлада. Таму сымбалічна, што свой зьезд мы таксама ладзім у гэты дзень. Каля 1,5 мільёнаў беларусаў сталі ахвярамі камуністычных злачынстваў — сталінскія рэпрэсіі, Вялікая айчынная вайна, Чарнобыль, Аўганістан. Сёньня камуністычная ідэалёгія пануе ў самых адсталых краінах сьвету, мы ня хочам далучыцца да іхняга сьпісу. Камунізм мае крывавае мінулае, шэрае сучаснае і ня мае будучыні», — сказаў А.Міхалевіч.

Яшчэ адзін арганізатар форуму Павал Севярынец зазначыў: «Сёньня камуністы могуць зьбірацца разам у Менску толькі з той мэтай, каб пакаяцца, але пакаяньня мы ад іх дакладна не дачакаемся. Мы ведаем, што іхны зьезд праходзіць пры зачыненых для незалежнай прэсы дзьвярах. Яны сабраліся ў Менску, як амаль сто гадоў таму ў доміку ля Сьвіслачы, каб зноў вярнуцца сюды. Мне згадваецца гісторыя з Эвангельля ад Мацьвея, калі злы дух выйшаў з чалавека. Троху паблукаўшы па сьвеце, ён вырашыў вярнуцца ў цела, узяўшы з сабой яшчэ сямярых духаў нават больш страшных за яго. Мы ня можам сёньня гэтага дапусьціць».

Але найбольш прысутных кранула гісторыя пастара Эрнэста Сабілы, які некалі прайшоў праз сталінскія лягеры.

«У лягеры я валіў дрэвы, гэта была праца для самых маладых і вынослівых. Але нават зь іх ня ўсе вытрымлівалі гэтыя зьдзекі. Шмат хто клаў на пень руку і адсякаў яе, каб не працаваць», — расказваў Э.Сабіла.

Гісторык Ігар Кузьняцоў прапанаваў пакінуць дзень 7 лістапада чырвоным днём у календары. «Чырвоным, бо паліты крывёй соцень ні ў чым не павінных ахвяраў. Нават сёньня 2/3 апазыцыйных палітыкаў — гэта былыя камуністы. У нас дзьве камуністычныя партыі КПБ і ПКБ. Адна кажа, што пасьля 1917 году ў нас было ўсё добра, другія — добра, але зь некаторымі памылкамі. Ніводзін зь сёньняшніх камуністаў не папрасіў прабачэньні за тыя злачынствы».

На форуме прысутнічалі госьці з Украіны, Расеі, таксама прыйшоў часовы паверany Чэскай Рэспублікі Ўладзімер Румл.

Быў сярод гасьцей форуму і лідэр АГП Анатоль Лябедзька, які сказаў, што ягоная першая перадвыбарчая праграма на дэпутацтва ў Вярхоўны Савет была цалкам напісаная на антыкамуністычных прынцыпах. Яшчэ Лябедзька заклікаў правесьці міжнародны трыбунал над лукашызмам.

Напрыканцы форуму яго ўдзельнікі была прынятая рэзалюцыя «У будучыню без камунізму».

**Зьміцер Панкавец**

### Лукашэнка: Дзякуючы Вялікаму Кастрычніку мы набылі незалежную дзяржаву

**Пра гэта піша А.Лукашэнка ў сваім звароце з нагоды 7 лістапада. «Рэвалюцыя далучыла мільёны людзей да працэсу пабудовы новага грамадзтва, не на словах, а на справе свабоднага ад эксплюатацыі, нацыянальнага прыгнёту і няроўнасьці», — мяркуе ён.**

### Лідэр ПКБ Сяргей Калякін у часе ўскладаньня кветак да помніка Леніну на 7 лістапада

**«У сёньняшняй Беларусі вельмі падобная сытуацыя да 1917 году. Узрастае пратэстны настрой, а краінай кіруе толькі адзін чалавек. Вялікі Кастрычнік меў сьветлыя мэты, якія, на жаль, не былі дасягнутыя да канца ў СССР. Калі б не было той рэвалюцыі, то не было б БНР і БССР, не было б сёньняшняй Беларусі, таму мы мусім помніць гэты дзень. Быць сапраўдным камуністам не было лёгка ніколі, а сёньня рабіць гэта шматкроць цяжэй. Цягам году амаль да кожнага сябра нашай партыі прыйшлі з КДБ, міліцыі і пракуратуры, каб даведацца пра іхнюю дзейнасьць. Нягледзячы ні на што, я веру ў перамогу справядлівасьці».**

**ЗП**

# Футбол 1982 году

Піша Віталь Тарас.

Дваццаць пяць гадоў — дастатковы тэрмін, каб асэнсаваць нейкую зьяву альбо падзею. Альбо, надварот, забыцца на яе. Нездарма нямецкі філёзаф Шпэнглер адразу пасьля Першай усясьветнай вайны прадказваў, што хутка ў Эўропе зноў будзе вайна — бо за дваццаць гадоў вырасьце новае пакаленьне, якое жахаў папярэдняй бойні ня зьведала. (Пазьней гэтую цытату выкарыстае ў сваім знакамітым фільме «Звычайны фашызм» Міхаіл Ром.)

За чвэрць стагодзьдзя любая падзея робіцца гісторыяй. Дваццаць пяць гадоў таму памёр Леанід Брэжнеў. Ці ёсьць сэнс пра гэта згадваць, калі адносна нядаўна «ўсё прагрэсіўнае чалавецтва» адзначыла 100-годзьдзе з дня ягонага нараджэньня? Але думаю, варта гаварыць сёньня не пра Брэжнева і не пра «эпоху застою», а пра яе заканчэньне.

## Дзень міліцыі

Пра тое, што здарылася нешта надзвычайнае і пагрозьлівае, датуль нечуванае ў жыцьці краіны, хоць і даволі чаканае, савецкія людзі здагадаліся яшчэ да таго, як з экранаў тэлевізараў і з радыёпрымачоў пачала гучаць клясычная музыка. Раптам з праграмаў тэлеперадач была зьнятая трансьляцыя сьвяточнага канцэрту, прысьвечанага Дню савецкай міліцыі. Калі б гэта быў канцэрт з нагоды дня чыгуначнікаў ці дня танкістаў, ніхто б не надаў гэтаму значэньня. Але канцэрт майстроў мастацтваў 10 лістапада ня быў звычайнай імпрэзай. Найлепшыя майстры тагачаснай савецкай эстрады прысьвячалі міліцыянтам найлепшыя свае творы і выступы, прычым рабілі гэта з поўнай душэўнай аддачай. Бо ўся мастацкая эліта тады толькі пачынала сядаць ва ўласныя аўтамабілі, і ёй хацелася быць у добрых стасунках з супрацоўнікамі ДАІ. Ну, і ня толькі ДАІ, зразумела. У канцэртах для міліцыі не лічылі для сябе ганебным браць удзел ні Мая Плісецкая, ні «Песьняры», ні зоркі меншага рангу. Міліцыя плаціла ўдзячнасьцю. Толькі на іх «прафэсійным» сьвяце дазвалялася выступаць з вострымі, амаль што антысавецкімі скетчамі гумарыстам, якія тады толькі пачыналі — Жванецкаму ды Хазанаву. Нічога падобнага, зразумела, нельга было сабе ўявіць падчас урадавага канцэрту з нагоды 7 лістапада, дзе галоўным ударным нумарам была якая-небудзь кантата «Ленін — заўжды жывы».



Часам некалькі чалавек могуць зрабіць больш, чым робяць цэлыя дзяржаўныя інстытуцыі.

Каб пазбавіць доўгачаканага сьвята савецкага гледача, які рыхтаваўся расслабіцца ля тэлевізара напярэдадні новага працоўнага тыдня, — на гэта павінны быць важкія прычыны.

Натуральна, членаў Палітбюро хавалі і да гэтага. Касыгін, Суслаў, Усьцінаў. Пахаваньні членаў Палітбюро ўспрымалася ўжо як звыклы крамлёўскі рытуал. Адным толькі ён надакучыў людзям — у жалобныя дні нельга было ні нармальную перадачу па тэлевізары паглядзець, ні ў кіно схадзіць, а пра музыку ўжо й казаць няма чаго. І ўсё ж, сьмерць вышэйшага кіраўніка савецкага арэапагу, хоць яе ніяк нельга было назваць нечаканай, была чымсьці суцэльна новым і таму нязвыклым для грамадзтва.

Перш за ўсё, у самім факце сьмерці генсека было нешта ненармальнае і няправільнае — бо яна была незаплянаваная і несанкцыянаваная. А тое, што над вышэйшым кіраўніцтвам краіны ёсьць яшчэ нешта вышэйшае — пра гэта і падумаць было страшна.

Гэта быў факт найвялікшай крамолы, бо ён не залежаў ад рашэньняў Палітбюро, праграмы партыі і неабходнасьці даваць адпор амэрыканскаму імпэрыялізму. Вось яшчэ чаму сьмерць Брэжнева спрабавалі схаваць ад народу. Народ, праўда, асабліва не перажываў і сьлёзаў ня ліў.

## Сон у руку

Але ж начальства сярэдняга й дробнага рангу было ўсур’ёз напалоханае маючымі адбыцца зьменамі на самым версе і ўжо ня так упэўнена сябе паводзіла з падначаленымі. Памятаю, мой шэф, які марыў мяне звольніць з тэлебачаньня і наагул зьвесьці са сьвету, у дзень пахаваньня не рабіў мне заўвагаў (чаго не было ніколі раней) і толькі сьвідраваў мяне ўвесь дзень з адлегласьці лютым позіркам, ня маючы на той момант цьвёрдай упэўненасьці, што ён застанецца ў фаворы ў свайго начальства й зможа па-ранейшаму круціць з падначаленых вяроўкі. Пры Андропаве і Чарненку ён яшчэ больш расправіў свае ідэйна-прапагандысцкія крылы, пры Гарбачову даволі хутка сышоў на другі плян, пры Шушкевічу ўвогуле кудысьці зьнік. А вось пры Лукашэнку, асабліва ў апошнія гады, зноў акрыяў, заняўшыся сваім улюбёным заняткам — апяваньнем вялікага савецкага мінулага на суконнай савецкай мове.

У такіх, як я, у тыя жалобныя дні настрой міжволі палепшаў — неяк сама сабой прыходзіла ў галаву думка, што цяпер жа, мусіць, усё будзе інакш. Прыйдуць нейкія новыя людзі, у якіх у галовах будзе меней савецкага ідыятызму і начотніцтва, пачнецца той самы навукова-тэхнічны прагрэс, пра які гаварыў на апошнім зьезьдзе КПСС Брэжнеў, пачнецца раззбраеньне, вернецца «разрадка напружанасьці», дзякуючы якой спачатку ў халадзільніках у начальства, а потым і ў многіх савецкіх грамадзянаў зьявілася ідэалягічна немагчымая датуль амэрыканская пэпсі-кола. (Да чароўнай кока-колы ўсё яшчэ было далёка.)

Толькі праз шмат гадоў стане зразумела: калі на чале дзяржавы стаіць стары хворы маразматык — гэта ня так страшна, чым калі ёй кіруе дыктатар, поўны сілаў і энэргіі.

Тады, аднак, нас яшчэ чакала напeрадзе разьмяшчэньне ракетаў сярэдняга радыюсу ў Беларусі ў адказ на амэрыканскія «Пэршынгі» ў Эўропе, мітынгі ў падтрымку нікарагуанскага народу ў ягонай барацьбе супраць «контрас», кампанія барацьбы за дысцыпліну з адлоўліваньнем людзей у лазьнях і кінатэатрах у працоўны час, новыя дзяржаўныя пахаваньні, ударныя вахты, камуністычныя суботнікі й

розная іншая нудота ды брыдота. Усё гэта было настолькі звыклым для савецкай рэчаіснасьці, што надыход гэтага «новага» ніколькі не зьдзіўляў і не расчароўваў. Пры Брэжневу не было чым ачароўвацца. Хіба што варанай кілбасой з паперы.

Але нічога падобнага да крушэньня камунізму й развалу СССР ніхто з маіх аднагодкаў, а тым больш — з пакаленьня бацькоў не чакаў і не прадбачыў, нават у сваіх снах. Хаця… Можа быць, дарэчы будзе прыгадаць тут адзін мой даўні сон, калі Брэжнеў яшчэ быў жывы. Склаўся той сон як бы зь дзьвюх частак, альбо сэрыяў. У першай «сэрыі» я няясна бачыў плошчу Леніна ў Менску, запоўненую сьвяточна апранутым шумлівым натоўпам. У архітэктурным абліччы плошчы, аднак, чагосьці яўна бракавала. Прыгледзеўшыся, я зразумеў (у сьне), што на ёй няма помніка правадыру. Наступнай начы мне прысьнілася тая ж плошча — толькі ўжо амаль пустая. А на месцы помніка Леніну стаяў танк Т-34 — той самы, што стаіць ля Дому афіцэраў.

## 7:0

Не хачу сказаць, што мне такім чынам прымроіўся далёкі жнівень 91-га. У Менску ваеннага становішча не было ніводнага дня. Ленін жа, як і танк, стаяць на сваіх ранейшых месцах. І плошча засталася тая ж самая. Звонку, быццам бы, плошча Незалежнасьці, а ўнутры, у падземцы— усё тая ж «плошча Леніна».

І камуністы розных краінаў сьвету зьяжджаюцца ў Менск і ўскладаюць кветкі да помніка правадыру ўсясьветнага пралетарыяту. Толькі расейскія камуністы паводзяць сябе ціха-ціха. Бо ў іх у Расеі зноў адраджаецца аднапартыйная сыстэма, але партыя ўлады называецца ўжо не КПСС. І не КПРФ.

А ў Менску фігурыны рабочых і калгасьнікаў па-ранейшаму ўпрыгожваюць Палац прафсаюзаў — архітэктурны шэдэўр сталінскага рэнэсансу на Кастрычніцкай плошчы. І помнікі Дзяржынскаму множацца год ад году па ўсёй Беларусі, бы тыя клоны.

І помнік Сталіну сьцеражэ пад Заслаўем старую маладэчанскую дарогу.

Хаця, стоп! Яго ж пры Брэжневу не было. І плошча пры ім называлася — Цэнтральная.

Дык што, выходзіць, усе гэтыя 25 гадоў мы рухаліся назад, а не наперад? А як жа незалежная Беларусь? Хаця дзяржаўная прэса па-ранейшаму піша: «на палетках рэспублікі» альбо «рэспубліканскія спаборніцтвы», а ў СМІ дамінуе расейская мова, як за часам Хрушчова.

А з усіх відаў спорту для нас па-ранейшаму важнейшым застаецца хакей.

Між іншага, той лістапад 1982-га трывала зьвязаўся ў памяці зь яшчэ адной — вельмі прыемнай — падзеяй. Тады менскае «Дынама» першы й апошні раз заваявала залатыя мэдалі футбольнага чэмпіянату СССР. Разгром маскоўскага «Дынама» (7:0 на выезьдзе!) і фантастычная перамога над «Спартаком» (4:3) у апошнім матчы прынесьлі беларусам чэмпіёнства. Для Беларусі гэта стала сапраўдным нацыянальным сьвятам. З гледзішча афіцыйнай савецкай ідэалёгіі тая радасьць была амаль непрыстойнай. Толькі-толькі савецкі народ «панёс цяжкую непапраўную страту», а тут… Людзі як бы скідалі зь сябе путы старых стэрэатыпаў, савецкі правінцыялізм: «Дзе нашаму цяляці ваўка зьесьці?»

Трэнэр Эдуард Малафееў казаў тады нешта пра «шчыры футбол». Мабыць, гэта была проста гучная фраза, пазбаўленая сэнсу. Насамрэч, стратэгія была такая: забіць больш, чым забіваюць табе. Але дынамаўцы паказвалі футбол высокай клясы. Што выраблялі на полі Алейнікаў, Гоцманаў, Зыгмантовіч! Выявілася, што беларусы ўмеюць і любяць гуляць у футбол, прычым у прыгожы футбол. Што яны ўмеюць і перамагаць — таксама, як да іх «Дынама» Кіеў, «Дынама» Тбілісі… Даўно няма тае менскае каманды, няма ўсесаюзнага чэмпіянату. Дый ня трэба пра гэта шкадаваць. Не пра тое размова.

Часам некалькі чалавек (асабліва, калі яны — каманда) могуць зрабіць больш, чым робяць цэлыя дзяржаўныя інстытуцыі. Яны могуць запаліць у людзях агеньчык надзеі.

Апошнія 25 гадоў нам не ставала перамог, удачы, пачуцьця ўпэўненасьці ў сабе. Можа, за гэты час вырасла новае пакаленьне, якое ня ведае, што такое пэсымізм і безнадзейнасьць?


1982год. Справа — абаронца менскага «Дынама» Юры Курненін.

# Затрымалі ўдзельнікаў сьвяткаваньня Хэлоўіну

Моладзь пасадзілі на суткі за маскарадныя касьцюмы.




ЯРАСЛАЎ СЬЦЕШЫК

31 кастрычніка а 19-й наведнікі сталічнага ЦУМу маглі назіраць дзіўнае відовішча: проста ля аддзелу канцтавараў гурма моладзі апранала маскарадныя касьцюмы. Праўда, досыць спэцыфічныя: вампіраў, зомбі і муміяў. Гэтая кампанія ўжо ня першы год віншуе менчукоў з Хэлоўінам, і з ЦУМу мусіў сёлета пачацца маскарад. Для грыму ў канцтаварах былі набытыя фарбы, а «муміі» дасталі заранёў прынесеныя бінты.

«Зомбі» намалявалі «вампірам» зубы, а «муміі» абматаліся бінтамі і густа ўкрывалі іх «крывавымі» плямамі. Вясёлая кампанія зьбіралася выходзіць на вуліцу, калі ў ЦУМ зайшлі міліцыянты. Удзельнікам сьвяткаваньня паведамілі, што яны «нагадваюць злачынцаў». Міліцыя затрымала чатыры «муміі»: Юрася Шаліна, Андрэя Кіма, Валянціна Сакалоўскага, Тацяну Лашкарову.

Іх адвезьлі ў Савецкі РУУС, склалі пратаколы за дробнае хуліганства: «у ЦУМе размотвалі бінты, перамазаныя чырвонай фарбай, і раскладалі іх на прылавак, на заўвагі прадаўцоў не рэагавалі». Затрыманыя аспрэчвалі пратаколы. Паводле іхных словаў, прадаўцы ЦУМу далі ім дазвол рыхтавацца да маскараду. Усе затрыманыя напісалі скаргі на імя начальніка РУУСу Сяргея Бясьсьмертнага на неправамерныя дзеяньні міліцыі.

Настрой усё яшчэ быў сьвяточны. Хлопцы жартавалі: «Летась апрануліся як зомбі — і нас не чапалі. А сёлета апрануліся муміямі — і ўсіх арыштавалі. Быць зомбі спакайней». У РУУСе затрыманыя сядзелі ўсё яшчэ абматаныя маскараднымі бінтамі й абмяркоўвалі пляны на сьвяточную ноч. Міліцыянты, якія заходзілі ў аддзяленьне, сьмяяліся і вадзілі адзін аднаго паглядзець на «монстраў». І так, відаць, іх упадабалі, што пакінулі сядзець у РУУСе на ноч.

На наступны дзень адбыўся суд над удзельнікамі сьвяткаваньня. Зранку іх прывезьлі да будынку суду Савецкага раёну і трымалі ў машыне некалькі гадзінаў. Пасьля таго, як судзьдзя запатрабавала ад міліцыянтаў перарабіць пратаколы, машына з затрыманымі зноў паехала ў РУУС. Як высьветлілася, міліцыянты ў пратаколах не ўказалі сьведак «правапарушэньня».

Пры канцы дня затрыманых прывезьлі ў суд, дзе яны падалі хадайніцтвы аб прадстаўленьні ім адваката. Судзьдзя задаволіла хадайніцтвы, наступнае паседжаньне было назначанае на 2 лістапада. Затрыманым выдалі пазовы й адпусьцілі. Аднак, на выхадзе з суду іх затрымалі ў другі раз. Як казалі міліцыянты, яны выконвалі загад намесьніка кіраўніка міліцыі Савецкага раёну Ўладзімера Сацюка. Сацюк прыняў рашэньне перавезьці ўсіх затрыманых на Акрэсьціна, бо «ня ўпэўнены ў тым, што яны зьявяцца паводле пазову».

Ноч усіх сьвятых скончылася для затрыманых 2 лістапада адміністратыўным арыштам. Тацяне Лашкаровай судзьдзя Савецкага раёну сталіцы Людміла Савасьцян прысудзіла пяць сутак адміністрацыйнага арышту. Юрасю Шаліну — сем сутак. «Я не чакаў, што мяне пасадзяць за маскарадны строй», — сказаў хлопец. Андрэя Кіма судзьдзя Аксана Ралява асудзіла на сем сутак арышту. Кім абвесьціў галадоўку. Валянціну Сакалоўскаму тая ж судзьдзя дала дзесяць сутак арышту.

Паказаньні пратаколаў не пацьвярджаюцца паказаньнямі сьведак: ні супрацоўнікамі ЦУМу, якія бачылі падрыхтоўку да сьвяткаваньня, ні сябрамі затрыманых, ні нават паказаньнямі міліцыянтаў, што праводзілі затрыманьне, зазначае адвакат затрыманых Сьвятлана Гарбаток. «Тут мы бачым хутчэй спробу суду выправіць памылку міліцыянтаў, якія перастараліся, чым пакараньне за хуліганства».

**Яраслаў Сьцешык**

**Хэлоўін**

сьвята, якое паходзіць ад старажытнага паганскага кельцкага абраду. Яго адзначаюць 31 кастрычніка. Найбольш папулярнае яно ў Ірляндыі і ЗША, адтуль разышлося па сьвеце. Калісь лічылася, што ў гэтую ноч можна вызваляць людзкія душы зь целаў чорных катоў, соваў і кажаноў. Цяпер Хэлоўін сьвяткуецца як вясёлае дзіцячае сьвята, калі людзі пераапранаюцца ў пачвараў і страшыдлаў. У ЗША дзеці ў масках у гэты вечар абыходзяць дамы, зьбіраючы слодычы як «адкупное».

# Дзякуй

**Аляксандру Я.** зь Нясьвіскага раёну.
**Валянціне М.** з Гомеля.
**Іне С.** з Барысава.
**С.К., Аляксандру Ф., Кірылу М., Ш., Тэрэсе Р., Міхаілу К., Тацяне Р., А.Б., Віталю С., Марыі А., Натальлі З., А.Р., Сьвятлане В., Леаніду Г., Аляксандру К., А.В.** зь Менску.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.


з ь б я р ы «Кнігарню «Наша Ніва»




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна.**




**Вясна народу:**
Эсэістыка 1991—2007


ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Змагары са склеромай

**Народ павінен ведаць сваіх герояў. Мне як былому мэдыку крыўдна за былых калегаў. Няхай хоць бы ў юбілеі адзначалі ня нейкае эфэмэрнае «чуткое внимание» служкаў мэдыцыны, а іхны рэальны ўнёсак у паляпшэньне здароўя народу.** А за гэта народ ім заўсёды ўдзячны і не забывае. Прыкладам таму — дзейнасьць лекара Станіслава Нарбута на Браслаўшчыне, якому тутэйшыя жыхары за свае грошы паставілі абэліск. І хаця пасьля сьмерці гэтага лекара прайшло больш за 80 гадоў, браслаўчане добрым словам памінаюць яго і сёньня.

Прапаную нататку пра двух прафэсараў-оталярынголягаў, у якіх сёлета былі юбілеі і якім беларусы абавязаныя значным паляпшэньнем свайго здароўя.

А што такое склерома? Калі сёньня пра гэта спытаць мінакоў на вуліцы, можа, адзін з сотні адкажа. А гэтая хвароба ў першай палове XX ст. лічылася нацыянальнай хваробай беларусаў (як для ангельцаў — бранхіт). У той час сярод кожнай тысячы жыхароў на тэрыторыі Беларусі было некалькі хворых склеромай.

Склерома належыць да эндэмічных (ад грэцкага «эндэмас» — мясцовы, уласьцівы гэтай мясцовасьці) хваробаў. Хварэюць на яе ў значнай большасьці жыхары вёсак у забалочанай мясцовасьці. У хворых на склерому, акрамя агульных прыкметаў хваробы (слабасьць, стомленасьць, санлівасьць, парушэньні апэтыту), узьнікаюць пухлінападобныя разрастаньні тканак носа і верхніх дыхальных шляхоў. У выніку зьнявечваюцца твары хворых, парушаюцца дыханьне, глытаньне, зьмяняецца голас.

На гэтыя акалічнасьці зьвярнуў увагу прафэсар Самуіл Бурак, калі ў 1925 г. прыехаў з Харкава ў Менск загадваць толькі што створанай катэдрай вуха, горла, носа мэдыцынскага факультэту БДУ.

С.Бурак прыклаў немалыя намаганьні, каб аб'яднаць у досьледах склеромы лекараў самых розных спэцыяльнасьцяў (ад оталярынголягаў і тэрапэўтаў да фтызыятараў і дэрматолягаў). Найбольш цесна прафэсар супрацоўнічаў з працаўнікамі Беларускага санітарна-бактэрыялягічнага інстытуту, зь якімі ўдзельнічаў у экспэдыцыях у склеромныя ачагі.

С.Бурак вёў і асьветніцкую работу сярод насельніцтва, даводзіў да ведама лекараў-спэцыялістаў вынікі сваёй дзейнасьці. Ён выдаў манаграфіі па праблемах склеромы, у якіх былі выкладзеныя найбольш поўныя сьведчаньні на той час пра гэтую хваробу, выпусьціў некалькі навукова-папулярных брашураў для насельніцтва, а таксама першы фундамэнтальны даведнік «Хваробы вуха, носа і горла» (усе на беларускай мове).

Прадаўжальнікам справы С.Бурака, пераемнікам ягонай катэдры стаў Мікалай Кніга, які пасьля заканчэньня вучобы на мэдфаку БДУ ў 1929 г. ужо ў 1940 г. апублікаваў першыя вынікі лячэньня склеромы. Ён адным зь першых у СССР скарыстаў стрэптаміцын для лячэньня гэтай хваробы.

Пры канцы XX ст. у Беларусі на працягу году рэгістраваліся ўжо адзінкавыя выпадкі захворваньня склеромай.

Плённасьці намаганьняў прафэсараў С.Бурака і М.Кнігі і іхных супрацоўнікаў паспрыялі праведзеная ў тыя часы мэліярацыя і іншыя сацыяльна-побытавыя зьмены ў жыцьці беларусаў. Але толькі паспрыялі, ня больш. Менавіта дзякуючы старанасьці гэтых мэдыкаў мы атрымалі магчымасьць забыць на такую хваробу.

**Генадзь Шэршань, Менск**

## Могілкі ў Пятроўшчыне

**Рана ці позна зьяўляецца ў чалавека жаданьне ціхім восеньскім днём паблукаць па старадаўніх кладах. Атрымаць колькі ўрокаў гісторыі, скласьці для сябе рамантычную гісторыю, дэтэктыў альбо нават трымценьнік.**

Не пераадолеў такога жаданьня і я, калі праходзіў паўз былыя вясковыя могілкі ў Пятроўшчыне, цяпер ужо часткі мэгаполісу, што паглынае навакольныя паселішчы.

Найбольш даўнія пахаваньні адносяцца да 1900 г. Пасярэдзіне старой часткі могілак пагорак — відаць, усё, што засталося ад капліцы. Абчасаныя валуны 10-х — 20-х гадоў, вылітыя з цэмэнту помнікі 30-х, зваранія з мэталічных трубаў крыжы 50-х, каменная крошка 70-х — 80-х, мармур і граніт пачатку XXI ст.

Мурашкі, Якутовічы, Жыгалкі, Козелы, Красьніцкія…

Вось помнік бацьку і сыну — Канстанціну Фёдаравічу (1900—1945) і Канстанціну Канстанцінавічу (1924—1943) Мурашкам. Надпіс «Загінулі на фронце». Ні ў 1945, ні ў 1943 фронт пад Менскам не стаяў, таму, відаць, пахаваныя нашыя хлопцы там, дзе напаткала іх сьмерць, а на Радзіме, пастаўлены помнік, каб было куды прыйсьці родным.

Побач на помніку лічбы: 1932—2.07.1944. Ад чаго знайшоў сваю сьмерць падлетак за дзень да вызваленьня Менску? Ад савецкай бомбы, ад кулі разьюшанага ўцёкамі акупанта, а мо ад хваробы, праз тое, што не было ніякіх лекаў?

Ала Пятроўна Трафімава (7.10.1941—17.05.1944) з двух з паловай гадоў свайго жыцьця ніводнага дня ні пражыла пад савецкай уладай. А вось Параша Юстынаўна Мурашка (1807—1902) за сваё жыцьцё пад якімі толькі ўладамі не жыла, нават напалеонаўскіх жаўнераў бачыла.

Вось спачывае «Ўладзімер Іліновіч 30 год X.1938. Памяць ад Ламаносава». Што здарылася з трыццацігадовым мужчынам у сумнавядомым 1938-м? Чаму ніхто з родных не паставіў яму помніка, а толькі сябра Ламаносаў? А мо й ня сябра зусім.

А якая трагедыя хаваецца за гэтым помнікам, па ўсім відаць, першай чвэрці XX ст., на якім пазначана: «Забітыя Кацярына год 40 і сын Уладзімер год 19 Мурашка».

Колькі архіўных запісаў трэба перагартаць, каб дазнацца, што за імя хаваецца за першымі ацалелымі літарамі «Пар...», а тут на помніку бачым — Пар... Казлоўскі.

Не мінайце ж, калі сустрэнуцца на шляху, старадаўніх могілак. Паблукайце па іх, каб узрушыць душу, зьдзірванелую ад будзённых дробязяў.

**Вячка Васілёнак, Менск**

## Кірмаш вышэйшых навучальных установаў Нямеччыны

**9—10 лістапада 2007 г. у Кіеве адбудзецца інфармацыйна-прэзэнтацыйны кірмаш вышэйшых навучальных установаў Нямеччыны.** Акрамя магчымасьці сустрэцца з прадстаўнікамі ВНУ Нямеччыны каля выставачных стэндаў, удзельнікі атрымаюць магчымасьць падрабязна даведацца пра пражываньне і навучаньне ў Нямеччыне. Прафэсары і навукоўцы, кіраўнікі аддзелаў працы з замежнымі студэнтамі ВНУ Нямеччыны распавядуць пра міжнародныя, нямецка- і англамоўныя навучальныя праграмы. Падрабязная інфармацыя: http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki

## Канфэрэнцыя «Масты свабоднай інфармацыі»

**4 сьнежня 2007 г. у г. Луцку (Украіна) адбудзецца канфэрэнцыя «Масты свабоднай інфармацыі» (Free Media Bridges). Арганізатар канфэрэнцыі — цэнтар «Наша справа» — запрашае да ўдзелу ў ёй студэнтаў, моладзь, прадстаўнікоў недзяржаўных арганізацыяў і ўсіх зацікаўленых асобаў.** Удзельнікі канфэрэнцыі — прадстаўнікі арганізацыяў зь Беларусі, Нямеччыны, Польшчы, Украіны і Францыі — засяродзяцца на трох асноўных тэмах: праграма «Моладзь у дзеяньні», далучэньне моладзі да мэдыя-праектаў, праграмы палітычнай асьветы. Апошні дзень падачы заявак — 15 лістапада 2007 г. Падрабязная інфармацыя: http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki

## Vyjście znachodzim zaŭsiody

U našaj škole adbyŭsia kruhły stoł na temu «Farmiravańnie nacyjanalnaje kultury». Pakazucha. Rasiejskamounaja nastaŭnica biełaruskaje movy vyvieła vučanicu ź vieršam Broŭki: voś jak u nas usio cudoŭna, jakija mierapryjemstvy pravodzim, zrabili ekskursiju na «Liniju Stalina».

Ad našaha, mastackaha, addzialeńnia daručyli čytać dakład mnie, ci nie adzinamu na ŭsiu školu, chto razmaŭlaje pa-biełarusku. Ja skazaŭ ščyra — heta nie farmiravańnie, a hibieńnie biełaruskaj kultury. Mova ž vyniščajecca. I tut ja niaścipła padzialiŭsia ŭłasnym dośviedam, jak ja navučaju dziaciej. Pieršy urok. Pavitalisia, paznajomilisia i ja kažu: «Dzieci, vy ŭžo zaŭvažyli, što ja razmaŭlaju tolki pa-biełarusku. Ale vy hetaj movaj nie vałodajecie, nia čujecie jaje ani ŭ siamji, ani ŭ škole. Tak što, jak tolki pačujecie niezrazumiełaje słova, dyk tut ža spyniajcie mianie i ja... na rasiejskuju movu pierakładać nia budu. Bo ŭ mianie taki žyćciovy pryncyp — nie vymaŭlać pa-rasiejsku ani słova». Vyjście znachodzim zaŭsiody, kalektyŭna, dzieci sami dadumvajucca.

Takaja pazycyja bolš spryjaje vyšejpamianionamu «farmiravanniu», ćym pazycyja nastaunicy, katoraja vyvodzić krejdaj na došcy «Lubicie i šanujcie rodnuju movu», i ŭ hety ž momant, adviarnuŭšysia da vučniaŭ: «Петя! Прекрати сейчас же дёргать девочек за косички!» Bo kožnym svaim rasiejskim słovam jana kaža: «Да плевать я хотела на эту самую мову».

I jašče adzin prykład. Razdaŭ kaleham žmieńku dziciačych prac — kieramičnyja miedaliki z vyjavaj Pahoni. Hetyja miedaliki, kažu, dzieci zrabili u pazaŭročny čas z maje ŭłasnaje formy. Ja paabiacaŭ addać kožnamu jahonuju pracu tolki tady, kali nazavie, što vyjaŭlena na miedaliku. I voś vynik u vas u rukach — našy dzieci nia viedajuć elementarnaha — nacyjanalnych symbalaŭ. Škoła zabaraniaje (ušled za dziaržavaju) viedać Pahoniu i biełčyrvona-biely ściah.

**Skulptar, pedahoh Henik Łojka**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Паболей 7-х лістападаў: розных і ўсякіх!

Каляндар сьвяточных датаў — здаецца, адзіная пасьпяховая зброя нашай дыпляматыі на ўсходнім кірунку. Мы, прыкладам, адзначаем падзеі 7 лістапада 1917-га, якія мелі месца ў далёкім горадзе, зь якім Беларусь зьвязвае хіба толькі тое, што там жыў і тварыў Скарына. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Чаму б не разьвіць посьпех: ня ўвесьці ў беларускі каляндар блок датаў, зьвязаных зь іншымі рознымі падзеямі ў Расеі? Гэта б яшчэ больш спрыяла росту папулярнасьці нашага рэжыму сярод Івановых і Сідаравых і адпаведна пазытыўна ўплывала на пазыцыю падчас перамоваў па цане на газ.

Заплюшчыў вочы і ўявіў сцэнку перамоваў прадстаўнікоў Газпраму і беларускага ўраду пасьля адпаведных каляндарных рэформаў...

***

**Газпрам:** Такім чынам, мы гатовыя пачынаць перамовы толькі ў выпадку, калі Беларусь афіцыйна перастане сьвяткаваць 20 сакавіка — Дзень нараджэньня лябрадора Коні — улюбёнага сабакі прэзыдэнта Пуціна.

**Сідорскі:** Ну, мы ж ня вінныя, што вы не сьвяткуеце сапраўдныя народныя славянскія сьвяты.

**Газпрам:** Усё было б добра, калі б вы Дзень лябрадора не паставілі на 21-е, а Дзень Штырліца — калі Пуцін упершыню паглядзеў «Сямнаццаць імгненьняў» і вырашыў стаць чэкістам — на 23-е. Народ Расеі не пасьпявае раздупліцца, як вы яго зноў дасылаеце ў запой.

**Сідорскі:** Гэта вашыя праблемы. Дарэчы, палата прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі разглядае праект сьвяткаваньня 24 сакавіка як Дзень мачыцеля ў сарціpах, а 26-га — як Сьвята пуцінскага дзюдаіста.

**Газпрам:** Калі ласка, пашкадуйце расейскі народ! Мы ня можам столькі піць! Колькі вам трэба за тысячу кубоў газу? Сто баксаў?

**Сідорскі:** Можа, вам яшчэ Тыдзень усенароднай радасьці славянаў з нагоды абраньня Сочы сталіцай Алімпіяды-2012 адмяніць?

**Газпрам:** Дзевяноста!

**Сідорскі:** Ну-ну. І месячнік памяці вэтэранаў байкоту эстонскіх кансэрваў у рамках кампаніі за помнік салдату ў Таліне таксама ў дадатак?

**Газпрам:** Восемдзесят!!!

**Сідорскі:** Ладна. Дамовіліся, стартавая цана перамоваў — восемдзесят. У сакавіку сьвяткуем толькі Дзень перамогі Расеі ў гандлёвай каньячна-віннай вайне з Малдовай. Толькі таму пагаджаюся, што сьпяшаюся на сьвяточны канцэрт з нагоды Сьвята прыяднаньня дна Ледавітага акіяну да Расеі. Калі б вы, расейцы, ведалі, што значыць для нас, беларусаў, гэты дзень! Сьвятое!

# Эўрапарлямэнт супраць тытуню: новы наступ

Падобна, эўрапейцы хутка масава пачнуць кідаць курыць. Наступ на згубную звычку ў Эўрасаюзе набірае абароты. Сьпярша на пачках зьявіліся агромністыя надпісы аб шкодзе курэньня, потым — карцінкі запалохваньня, потым шмат у якіх краінах забаранілі курыць у рэстарацыях і барах і нават сталі казаць аб праве працадаўцы не прымаць на працу курцоў. А нядаўна Эўрапейскі Парлямэнт заклікаў канчаткова забараніць курэньне на працы і ў грамадзкіх месцах. Адпаведны праект дакладу Старшыні Камітэту Эўрапейскага Парлямэнту па навакольным асяродзьдзі і ахове здароўя Карла-Хейнца Флорэнца_быў прыняты ў канцы лістапада на паседжаньні Эўрапарлямэнту ў Страсбургу. За прагаласавалі 561 дэпутаты, супраць — 63, устрымаліся — 36.

У дакумэнце, прынятым з ўласнай ініцыятывы Эўрапарлямэнту, адзначаецца, што каля 650 тыс. жыхароў ЭС штогод гінуць ад курэньня, 80 тысячаў зь іх — людзі, якія становяцца ахвярамі пасіўнага курэньня. У сувязі з гэтым дэпутаты віталі «Зялёную кнігу» Эўракамісіі «Да Эўропы, свабоднай ад тытунекурэньня: палітыка на эўрапейскім узроўні», аднак адзначылі, што гэты дакумэнт зьяўляецца яшчэ толькі адпраўной кропкай у барацьбе з курэньнем.

Дэпутаты заклікалі Эўракамісію аднесьці дым тытуню да 1-га клясу канцэрагенаў і раілі краінам-чальцам на працягу двух гадоў увесьці забарону на курэньне ва ўсіх закрытых працоўных месцах, закрытых грамадзкіх будынках і на транспарце. Калі гэтыя парады ня будуць выкананыя, Эўрапарлямэнт заклікае Эўракамісію ўхваліць прапановы па абароне людзей, якія ня кураць у рамках заканадаўства аб абароне працоўных да 2011 г.

**650 тыс. жыхароў ЭС штогод гінуць ад курэньня, 80 тысячаў зь іх — людзі, якія становяцца ахвярамі пасіўнага курэньня.**

Акрамя таго, дэпутаты прапанавалі Эўракамісіі падрыхтаваць даклад аб кошце курэньня і ўдыханьня табачнага дыму для нацыянальных сыстэмаў аховы здароўя і эўрапейскай эканомікі. (Паводле прагнозаў ВОЗ, паталёгія, зьвязаная з паленьнем, да 2010 г. можа стаць прычынай страты ў Эўропе да 165 млрд даляраў ЗША).

Дэпутаты таксама заклікалі да ўвядзеньня забароны на продаж тытунёвых вырабаў дзецям да 18 гадоў. У прыватнасьці, вядзецца пра забарону разьмяшчэньня аўтаматаў для продажу цыгарэтаў у месцах, даступных для падлеткаў і забароне дыстанцыйнага продажу цыгарэт праз інтэрнэт непоўнагадовым.

Дарэчы, колькасьць курцоў у Эўропе з 2003 году няўхільна зьніжаецца прыблізна на 2—3% у год.

## Навошта закрываць «курылкі» на працы?

Узровень утрыманьня манаксіду вугляроду (чаду) у адкрытых для курэньня грамадзкіх месцах у краінах-чальцах Эўрасаюзу перавышае максымальна дапушчальны паказьнік забруджваньня паветра — аб гэтым сьведчаць вынікі спэцыяльнага дасьледаваньня, абнародаванага днямі ў Брусэлю. Дасьледаваньне праводзіцца з сакавіка 2006 году ў дзяржавах ЭС у рамках ініцыяванай Эўракамісіяй буйнамаштабнай кампаніі па барацьбе з курэньнем, ім у Эўропе ахопленыя звыш ста тысячаў курцоў і людзей, якія ня кураць.

Як высьветлілі спэцыялісты, сярэдняя колькасьць чаду, якую выдыхаў падчас курэньня кожны з амаль 50 тыс. курцоў-удзельнікаў экспэрымэнту, дасягала канцэнтрацыі 17,5 мкг. І гэта пры тым, што ўцягнутыя ў дасьледаваньне эўрапейцы выкурвалі толькі адну — пяць цыгарэтаў за дзень, — адзначаюць экспэрты. Між тым, у гарадах дзяржаваў ЭС максымальна дапушчальны ўзровень забруджваньня чадам паветра ў грамадзкіх месцах складае 8,5 мікраграмаў.

У нас жа Міндароў ужо даволі даўно распрацоўвае комплексную праграму, скіраваную на барацьбу з тытунем. Пакуль гаворка ідзецца аб прапагандзе здаровага ладу жыцьця сярод моладзі і магчымай забароне курэньня ў барах і рэстарацыях шляхам стварэньня асобных заляў для курцоў.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўрасаюзу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭС.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Стагодзьдзе Міхала Вітушкі

Агент немцаў, а пасьля амэрыканцаў. Жывы пасьля сьмерці. Гісторык **Сяргей Ёрш** зноў спрабуе разгадаць таямніцы лідэра беларускага антысавецкага супраціву і публікуе невядомыя раней фота.

На 5 лістапада прыпадаюць 100-я ўгодкі з дня народзінаў Міхала Вітушкі, кіраўніка паваеннага беларускага антысавецкага Супраціву. Ён пражыў доўгае жыццё, памёр летась у Заходняй Нямеччыне ў 98 гадоў. Дакумэнтальныя доказы гэтага дагэтуль не апублікаваныя, таму ня дзіўна, што ёсьць нямала тых, хто ня верыць у згаданую вэрсію лёсу Міхала Вітушкі. Гэта паказаў і нядаўні форум на сайце «Нашай Нівы».



## Эміграцыйная прэса пісала не пра Вітушку, а пра дзейнасьць «Вітаўта»

Варта патлумачыць, што калі ў 1991 годзе я пачаў дасьледаваць Беларускі паваенны Супраціў, на той час не існавала ніводнай працы, напісанай на гэтую тэму. Існавалі толькі некалькі дзясяткаў публікацыяў у эміграцыйным друку, якія пераважна зьявіліся ў канцы 40-х — пачатку 50-х. З супрацьлеглага боку можна хіба толькі назваць тэндэнцыйную кнігу Васіля Раманоўскага «Саўдзельнікі ў злачынствах» (Менск, 1964). І ўсё. Пачынаць даводзілася з нуля, складаючы бібліяграфію, пэрыядызацыю, першыя біяграмы Родзькі, Вітушкі, Гелды, запаўняючы шматлікія «белыя плямы» вэрсіямі. З 1993 году пачалі зьяўляцца мае публікацыі. Памылак хапала. У апошнія гады яны выпраўленыя (гл. кнігу «Беларускі Супраціў», напісаную разам з а. С.Горбікам і выдадзеную ў 2006 г. у Львове). На жаль, ёсьць аматары выцягваньня з нэту старых артыкулаў, якія абсалютна не бяруць увагі на найноўшыя публікацыі.

Як высьветлілася, большасьць артыкулаў у беларускім эміграцыйным друку ў канцы 1940-х — пачатку 1950-х гадоў пра «партызанскі рух Вітушкі» насамрэч апісвала дзейнасьць аўтаномнай беларускай арганізацыі «Вітаўта» (пры гэтым, відавочна, перабольшвалі яе маштабы), якая дзейнічала на Віленшчыне і ў Летуве (яе амаль цалкам ліквідавалі ў канцы 1947-га). Яшчэ на канфэрэнцыі партызанскіх камандзіраў у верасьні 1945-га ў Белавескай пушчы М. Вітушка забараніў сваім падначаленым самастойна кантактаваць з эміграцыйнымі арганізацыямі і даваць ім інфармацыю пра структуру партызанскага руху ды яго дзейнасьць.

## Хто «пахаваў» Вітушку каля возера Кернава?

Вэрсія пра гібель Міхала Вітушкі ў студзені 1945 году ў Рудніцкай пушчы на Віленшчыне зьявілася дзякуючы апэратыўнікам савецкай дзяржбясьпекі. Гэта яны не разабраліся ў складанай гульні, якую вялі нямецкія спэцслужбы і кіраўнікі беларускай падпольнай арганізацыі «Чорны Кот». Некалькі гадоў МГБ СССР верыла, што Вітушкі няма ў жывых. Пасьля высьветлілася, што яны памыліліся. Аднак афіцыйна гэта не было прызнана, таму міт дажыў аж да нашых часоў.

Захаваліся сьведчаньні маёра МГБ Віктара Іванова. У студзені 1955 году яго арыштавалі «за измену родине», а насамрэч — за ўдзел у фальсыфікацыях крымінальных справаў у часы Берыі. Падчас сьледства ён распавёў шмат дзіўных

рэчаў. Паводле ягоных словаў, яшчэ ў час вайны на загад Л. Берыі было выраблена больш за 4600 савецкіх пашпартоў узору 1939—1940 гг. на імёны «наиболее активных предателей». Адной з задачаў гэтай акцыі было даказаць савецкае грамадзянства асобаў, якія да 1939 году жылі на тэрыторыі Польшчы, Летувы, Латвіі і Эстоніі. Іваноў сьведчыць, што гэтыя пашпарты падкладваліся арыштаваным, а таксама забітым «противникам советской власти». (Крымінальная справа Іванова Віктара Сяргеевіча № 274/56-11, арк. 267. Цэнтральны архіў ФСБ РФ.)

Зь верасьня 1944 г. да чэрвеня 1945 г. В. Іваноў быў прыкамандзіраваны да асобай групы МГБ на тэрыторыі БССР. Дзейнічала яна і ў сумежных раёнах Летувы. Іваноў быў удзельнікам ліквідацыі атраду АК каля возера Кернава ў студзені 1945 году. Ён сьведчыць, што ўдзельнічаў у апазнаваньні цела «известного пособника немецко-фашистских оккупантов М.О. Витушки». Апазнаваньне базавалася выключна на сьведчаньнях затрыманых, бо даставіць труп у Менск ці Маскву для дэтальнай экспэртызы не было магчымасьці. Труп быў эксгумаваны, паводле паказаньняў некалькіх акоўцаў. Аднак у тым раёне ў той час дзейнічалі буйныя аддзелы АК, і чэкісты не хацелі абцяжарваць сябе трупам.

В. Іваноў сьведчыць, што да матэрыялаў справы быў прыкладзены пашпарт М.А. Вітушкі, які камандзір асобай групы МГБ атрымаў у Маскве. (*Тамсама, арк. 321.)

У красавіку 1945 году некалькі членаў асобай групы, у тым ліку і Іванова, выклікалі ў Маскву для дачы тлумачэньняў па факце выяўленьня «М.А.Вітушкі» іншым аддзелам МГБ і ягонага пакараньня сьмерцю ў канцы лютага — пачатку сакавіка 1945-га. Сьцьвярджалася, што пры «задержанном оказались немецкие документы на имя М.О. Витушки». Камісія МГБ зьверыла паказаньні прадстаўнікоў асобых групаў і зрабіла выснову, што дзе б ні скончыў жыцьцё «враг народа», гэта неістотна. Усе чэкісты-апэратыўнікі атрымалі вымовы за «служебную халатность». (*Тамсама, арк. 326.)

Гэтыя дакумэнты шмат што тлумачаць. Яны пацьвярджаюць наяўнасьць двайнікоў Міхала Вітушкі і сам факт існаваньня «апэрацыі прыкрыцьця». Насамрэч, каля возера Кернава загінуў Мікалай Вітушка, былы афіцэр Чырвонай Арміі, агент абвэра, які неаднаразова перакідваўся з заданьнямі ў савецкі тыл. Гэта ён ачольваў дэсант 17 лістапада 1944 году.

Міхал Вітушка са сваім атрадам напрыканцы сьнежня 1944 году быў перакінуты ў раён Варшавы, дзе ў спэцбункеры быў разгорнуты Галоўны штаб беларускага партызанскага руху.

## Напад на Навагрудак быў, але ім камандаваў не Вітушка

На згаданым форуме «НН» ставіўся пад сумнеў напад беларускіх партызанаў на Навагрудак у 1948 годзе. Упершыню пра гэтую акцыю 15 верасьня 1949 году напісала эміграцыйная газэта «Беларускае слова», якую ў Заходняй Нямеччыне рэдагаваў Юрка Віцьбіч. Паводле гэтай публікацыі, горад на некалькі гадзінаў захапіў 500-асобавы атрад на чале зь Вітушкам, былі захопленыя будынкі МГБ, савецкіх і партыйных установаў, казармы, вызваленыя вязьні з турмы.

Насамрэч, той апэрацыяй камандаваў былы афіцэр Чырвонай Арміі, вядомы на мянушку «Сьцяпан». Да гораду былі сьцягнутыя партызанскія групы агульнай колькасьцю ад 130 да 170 чалавек (сярод іх была і група ўкраінцаў-бульбаўцаў). Іх задачай быў не захоп Навагрудка, а вызваленьне з турмы МГБ арыштаванага дзеяча Беларускага Супраціву. Пасьля пасьпяховага правядзеньня апэрацыі, беларускія партызаны хутка пакінулі горад. Распавядаю пра яе паводле ўспамінаў былога камандзіра партызанскага атраду «Белавежа».

Пра захоп Навагрудка атрадам «Чорнага Ката» і вялікія страты савецкага боку паведамляе кніга «Память: гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёну» (с. 537).

## Беларуская эміграцыя маўчала

Беларуская эміграцыя ня ўдзельнічала ў дыскусіях у справе Міхала Вітушкі, якія ад сярэдзіны 90-х адбываліся ў незалежным і дзяржаўным друку на Бацькаўшчыне. Яна маўчала. Максымум, што рабілася — гэта перадрукі артыкулаў, у тым ліку з «Нашай Нівы», у амэрыканскім «Беларускім дайджэсьце»

Хіба толькі адна таронцкая газэта «Беларускі голас», якую рэдагаваў Сяргей Хмара (Сіняк, у канадзкіх дакумэнтах — Мар'ян Зіняк), некалькі разоў пісала на гэтую тэму. Беларускі эміграцыйны дасьледчык Юрка Стасевіч у артыкуле, прысьвечаным паваеннай партызанцы, адзначаў, што «лёс Вітушкі й Ганька невядомы. ГПУ (маецца на ўвазе КГБ — С. Ё.), па афіцыйных вестках, значна пазьней шукала іх аж у Казахстане і іншых мясьцінах Азіі, дзе яны мелі ўкрывацца». (Стасевіч Ю. Беларуская партызанка па II вайне // Беларускі голас, 1981, № 292, красавік.)

Гэтая інфармацыя цікавая найперш тым, што побач з прозьвішчам Вітушкі згадваецца і прозьвішча Міхала Ганька. Пра ягоны ўдзел у паваенным Супраціве да таго часу ніхто не пісаў.

Праз два гады пасьля той публікацыі Стасевіч друкуе ў «Беларускім голасе» рэцэнзію на сумнавядомую кнігу Лофтуса і называе Міхала Вітушку сярод жывых дзеячоў беларускай эміграцыі! Ягонае прозьвішча ён паставіў побач з Касмовічам, Адамовічам, Тумашам, Калубовічам і Касяком. (Стасевіч Ю. Беларускі Сакрэт // Беларускі голас, 1983, № 307, люты.)

Гэта была адна з апошніх публікацыяў Стасевіча, неўзабаве ён памірае. Больш ніхто ў эміграцыйным друку пытаньня лёсу М. Вітушкі не ўздымаў.

Вясной 1997-га я прапанаваў намесьніку старшыні Рады БНР Барысу Рагулю ўшанаваць на заплянаванай на ліпень у Вільні сэсіі Эўрапейскага сэктару Рады БНР памяць Міхала Вітушкі. Рагуля спачатку пагадзіўся, прапанаваў напісаць даклад, зазначыў толькі, што «параіцца з нашымі вэтэранамі». На сэсіі гэтае пытаньне Рагулем не ўздымалася, ясных тлумачэньняў ён мне ня даў (пасьля ў пратакол сэсіі будуць уключаныя словы пра ўшанаваньне памяці генэрала Вітушкі і іншых змагароў). Можна было б падумаць, што Рагуля навёў даведкі і атрымаў інфармацыю, што Вітушка яшчэ жывы.


The report

Special commission of a Congress of USA

About activity of organization "The black cat"

Under the direction of the leader of the Byelorussian national resistance

Mihas Vitushka

In territories USSR and PNR

1945 - 1956

## Жыцьцё Вітушкі на Захадзе

Дакумэнтальных сьведчаньняў пра гэты пэрыяд жыцьця Міхала Вітушкі ў нашым распараджэньні амаль няма. Ёсьць сьведчаньні двух удзельнікаў беларускага партызанскага руху (беларуса і немца), якія цяпер жывуць у Нямеччыне. Ёсьць вокладка дакладу пра дзейнасьць «Чорнага Ката» і яго кіраўніка, «лідэра Беларускага нацыянальнага рэзыстансу» Міхася Вітушкі на тэрыторыі СССР і Польшчы ў 1945—1956 гг., накіраванага ў спэцыяльную камісію Кангрэса ЗША.

Працяг на старонцы 22.

# Стагодзьдзе Міхала Вітушкі

**Працяг са старонкі 21.**

Паводле аднаго з арганізатараў УПА Максіма Скарупскага, які добра ведаў Вітушку, сьляды яго «губляюцца на эміграцыі пасьля 1975 году. Адзначым, што Скарупскі, як і Вітушка, супрацоўнічаў з заходнімі спэцслужбамі, таму ён і мог яго добра ведаць.

Дзесьці ў сярэдзіне 70-х Вітушка выходзіць на пэнсію. Пачынае пісаць успаміны (за імі цяпер шмат хто палюе, але беспасьпяхова, пакуль не пашанцавала і мне), кантактуе зь некаторымі дзеячамі беларускай эміграцыі. Даказаць дакумэнтальна гэтыя кантакты амаль немагчыма. Вось што напісаў у лісьце зь Нямеччыны пасьля прачытаньня згаданага форуму «НН» былы камандзір партызанскага атраду «Белавежа»:

«Ці вырашыць пытаньне факт, што Вітушка [на Захадзе] меў справу з малавядомымі сучаснай беларускай гісторыі людзьмі? Напэўна ж, не! Ім падавай сустрэчы, як мінімум, з прэзыдэнтам ЗША! А калі людзі сустрэліся канспірацыйна і нікому пра гэта не казалі? А калі абодва чалавекі памерлі і ўспамінаў [пра сустрэчу] няма — канспірацыя была тады? Я ведаю, што Астроўскі па тэлефоне зь Вітушкам некалькі разоў размаўляў, магчыма, нават сустракаўся. Але ж пісьмовых доказаў ня маю.

Раз сьв. пам. Уладзімер [Сенька, бліжэйшы паплечнік М. Вітушкі, ягоны прадстаўнік на Захадзе падчас партызанкі — **СЁ**] прагаварыўся: а. Леў [Гарошка] — наш амбасадар у легальным сьвеце. Умее і здатны захоўваць таямніцы. Калі той быў у Рыме, нашы да яго прыяжджалі. Ці пакінуў ён пра гэта нататкі, невядома…».

Наперадзе нас чакаюць яшчэ спрэчкі ў справе ацэнкі дзейнасьці М. Вітушкі і кіраванага ім партызанскага руху. Важна ня йсьці шляхам «бандэраўскіх» гісторыкаў, для якіх існуе толькі гераічная гісторыя УПА, а шмат на што яны заплюшчваюць вочы. Вось і Шухевіч, які адзначыўся ўдзелам у карных акцыях у Беларусі, стаў «героем Украіны». Варта гаварыць пра трагічнасьць сытуацыі, якую выбралі для сябе Вітушка і ягоныя партызаны. Атрады «Чорнага Ката» ствараліся ад пачатку ня як самастойныя баявыя адзінкі, а пры падтрымцы нямецкіх спэцслужбаў, праходзілі адмысловую падрыхтоўку, атрымалі ў сваё распараджэньне сетку бункераў, зброю, сродкі сувязі. Адпаведна, мусілі выконваць нямецкія загады аж да капітуляцыі Нямеччыны. Ад 1947 г. распачалося супрацоўніцтва арганізацыі Вітушкі з заходнімі спэцслужбамі. Таму МГБ разглядаў барацьбу зь ёй як змаганьне з «амэрыканскай выведнай сеткай». Гэта, дый праца шэрагу беларускіх палявых камандзіраў і канспірацыйнікаў у заходніх спэцслужбах пасьля сыходу на Захад, прымушае іх маўчаць і сёньня. Многія дакумэнты пра іх барацьбу на Бацькаўшчыне дагэтуль засакрэчаныя, і ня толькі на Ўсходзе, але і на Захадзе.

## З АБМЕРКАВАНЬНЯ НА ФОРУМЕ NN.BY

**Зьміцер Карась напісаў(ла)**
**Лістапад 5, 2007 у 18:48**

Дзякуй за такі грунтоўны адказ. Але... «Памяць» перапісала Ваш артыкул з «Пагоні»! Вось і ўсё. Так нараджаюцца байкі.

Я прагледаў за 1948 год «спецдонесения» МГБ для першага сакратара Гарадзенскага абкаму т. Калініна. (яны знаходзяцца ў былым архіве Гарадзенскага абкаму і даўно рассакрэчаныя). Няма сьлядоў захопу Наваградку ў архівах — і ўсё тут. Мясцовыя жыхары пра гэта не памятаюць. У 1948 г. ніводная антысавецкая партызанка (украінская, польская, летувіская) ня мела сілаў, каб захапіць раённы цэнтар.

Паводле «Памяці» і Вашага артыкулу ў «Пагоні», у Наваградку загінула каля 300 чалавек пераважна НКВДэшнікаў). Цікава, дзе яны пахаваныя?

Усе баі, напрыклад, АК на Гарадзеншчыне значацца магіламі НКВД—МГБ. Вы маглі быць, напрыклад, у Сьвіслачы на магіле брата Каліноўскага, там недалёка знаходзіцца магіла пабітых у 1944 г. гэбэшнікаў (на фота — **Рэд.**). Пабіў іх атрад Лупашкі. Падобныя магілы ў Горадні, Лідзе, Іўі. 300 забітых НКВДэшнікаў — ім бы маўзалей у Наваградку паставілі!

**Аматар напісаў(ла)**
**Лістапад 5, 2007 у 19:04**

Не, спадар Сяргей, непераканаўча гучыць. На Вас выйшаў сам Вітушкаў сын? От каб проста паведаміць пра сьмерць? І пра ўспаміны — скуль вядома? Калі сын расказаў — то што, бацька ад сына схаваў? А пра былога камандзіра — гэта таксама сур'ёзна? Няўжо не разумееце, што факт спатканьня Вітушкі з «малавядомымі сучаснай беларускай гісторыі людзьмі» багата што вырашыць? Тым больш для нас, каму ўсе гэтыя асобы — вядомыя?

**DUG напісаў(ла)**
**Лістапад 5, 2007 у 20:04**

Зьміцер Карась, а ці шмат Вы бачылі магіл гэбэшнікаў у раёне Васілішак, дзе дзейнічаў атрад АК Радзівоніка і ягоных пасьлядоўнікаў? я, напрыклад, наагул ня бачыў! а вось запісаў аб іхных дзеяньнях багата дзе ёсьць!

**Зьміцер Карась напісаў(ла)**
**Лістапад 5, 2007 у 20:47**

На Шчучынскім РАУС вісіць памятная шыльда — частка з пабітых была ліквідаваная атрадам Олеха. Магілы іхныя я не шукаў — навошта — пра Олеха і ягоны атрад сапраўды вельмі шмат у спэцданясеньнях МГБ — Сяргей Прытыцкі, першы сакратар Гарадзенскага абкаму КП(б)Б у 1949 годзе, налічыў 123 ліквідаваныя атрадам асобы.

Паверым Прытыцкаму?

...калі быў вялікі бой — а паводле апісаньня спадара Ярша ў Наваградку была сапраўдная бітва і палягло 300 чалавек, пераважна НКВДэшнікаў — то большасьць зь іх павінна быць пахаваная ў Наваградку. Атрад Олеха такіх вялікіх бітваў ня меў (выключэньне за нямецкай акупацыяй і ўдзел у апэрацыі «Вострая Брама»). Гэта была перш за ўсё самаабарона і тэрарыстычныя акты супраць прадстаўнікоў савецкай улады і сексотаў. Як і ўсе антысавецкія партызаны, яны чакалі з сусветнай вайны... Не дачакаліся.

...у Старых Васілішках пахаваны Фелікс Сяргей (старшыня сельсавету вёскі Арцішы). Актыўны ўдзельнік раскулачваньня, не адна сялянская сям'я паехала ў Сібір дзякуючы гэтай асобе. Ён быў ліквідаваны постакаўскім партызанскім атрадам летам 1949 г. Цікава, што сярод ягоных забойцаў былі ягоныя сваякі. «Грамадзянская вайна самая бязьлітасная...»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ненавукова напісаў(ла)**
**Лістапад 5, 2007 у 21:19**

Зноў не атрымалася зрабіць сэнсацыю. Рабіць высновы на падставе вокладкі (sic!) дакладу і сьведчаньняў дзьвюх асобаў... ну несур'ёзна ўсё гэта, прабачце. Праблема дзейнасьці/нядзейнасьці Вітушкі ёсьць, але й гэтая публікацыя сп.Ярша нічога для яе вырашэньня не дадае. Толькі пацьвярджае невырашанасьць ды зноў працуе на стварэньне міту. А сэнс?

І яшчэ... крыху ўяўляючы сабе, што такое таронцкі «Беларускі голас», ня думаю, што друкаваныя там матэрыялы можна ўспрымаць як гістарычную крыніцу.

**Stralcou-Karwacki напісаў(ла)**
**Лістапад 6, 2007 у 0:04**

Nia warta isci szlacham niekatorych ukrainskich historykau, jakija malujuc wykluczna pazytyunyja baki dziejnasci swajoj partyzanki. Z takimi mitami wielmi lohka zmahacca naszym niadobrazyczliucam, bo ich wielmi lohka abwierhnuc. Treba kazac usiu praudu — pryhozuju i niepryhozuju.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Новыя беларускамоўныя бігборды ў Менску.**

## Мароз уначы і халепа ўдзень

Да канца тыдня надвор’е будзе слотнае. 8 лістапада чакаецца дождж і мокры сьнег. Тэмпэратура паветра ўначы ад 0 да 5—7 градусаў марозу. Удзень будзе ад мінус 4 да плюс 3. У канцы тыдня Беларусь зноў апынецца пад уплывам актыўнага атлянтычнага цыклёну, які прынясе сьнег. Ноччу будзе ад 0 да 6 марозу, пры выясьненьнях да мінус 8 градусаў. Удзень ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

## Не ўспамінай імя дарэмна...

Фільм Кіры Муратавай «Два ў адным» раптоўна зьнялі з праграмы фэстывалю «Лістапад» на загад Міністэрства культуры. У фільме слыннай украінскай рэжысэркі сэкундаў на трыццаць зьяўляецца Лукашэнка: ён віншуе беларускі народ з Новым годам. Пэрсанажы глядзяць тэлевізар, і герой Багдана Ступкі кажа: «В-в-відный мужчіна!» Вось і ўсё.

## Грузавік раздушыў фурманку

Каля вёскі Вялікая Валахва Баранавіцкага раёну кіроўца аўтамабіля ГАЗ не заўважыў фірманку. Сутыкненьне аказалася сьмяротным для фурмана.

Як паведамілі ў ДАІ, за дажджыстыя суботу і нядзелю ў краіне здарыліся 52 аварыі. Аж 9 чалавек загінулі, 57 параненыя.

## У Расеі застрэлілі беларуса

Трох працоўных расстралялі на цагельні ў Інгушэціі, у сяле Яндарэ. Уначы на 5 лістапада пяць забойцаў у масках зайшлі ў інтэрнат цагельні, выбілі дзьверы ў памяшканьні, дзе былі працоўныя, і адкрылі па іх агонь з аўтаматаў. Жыхар Беларусі й два расейцы загінулі. Днём раней у суседняй Кабардзіна-Балкарыі невядомыя расстралялі ў лесе дзевяць палясоўшчыкаў і лоўчых. Яны былі знойдзеныя зь зьвязанымі рукамі й агнястрэльнымі раненьнямі ў патыліцу.

## Прайдзісьветы 8 гадоў абкрадалі «Белмэдпрэпараты»

Восем гадоў на РУП «Белмэдпрэпараты» дзейнічала арганізаваная злачынная група, якая выцягнула з прадпрыемства 670 млн рублёў. Мяркуецца, што ўзначальвалі яе галоўны бухгальтар і намесьнік дырэктара па фінансах і эканоміцы. Службовыя асобы разам з шасьцю памагатымі (двое зь іх працавалі на «Белмэдпрэпаратах» бухгальтарамі) прыкладна ў 1998 г. стварылі злачынную схему па крадзяжы грошай з рахунку прадпрыемства.

## Уваход на новыя станцыі мэтро будзе бясплатным

Такі падарунак чакае першых пасажыраў новых станцыяў «Барысаўскі тракт» і «Уручча» ў дзень адкрыцьця 7 лістапада.

## Семяховічы: вёска кантрабандыстаў

Адзіная дарога «з пакрыцьцём» у падпінскую вёску Семяховічы ідзе цераз Украіну. Тутэйшыя школьнікі штодня чатыры разы — у школу і дадому — перасякаюць дзяржаўныя межы. Бяз права на прыпынак. Кавалак Украіны памерам 10 кв. км урэзаўся ў тэрыторыю Беларусі. І тры кілямэтры пабудаванай за саветамі дарогі на Семяховічы апынуліся якраз на зямлі Украіны. Дарогу гэтую не аб’ехаць.

У Семяховічах жывуць пераважна пэнсіянэры. Школьнікаў толькі трое. Юля Махначова — 15 гадоў, Андрэй і Арцём Місюты — родныя браты. Дзеці мусяць наведваць школу ў вёсцы Жыдча Пінскага раёну, да якой 15 км. Пад’ём — а шостай раніцы. У 7.00 прыяжджае школьны аўтобус.

Кіроўца і пасажыры мусяць захоўваць вызначаны парадак перасоўваньня ў памежнай зоне. Як мінімум чатыры разы ў дзень школьны аўтобус прыпыняюць украінскія ды беларускія мытнікі.

«У Сяляховічах — перавалка для кантрабанды», — даводзіць участковы міліцыянт Андрэй Чорны, — сюды таемна дастаўляюць тавары без акцызаў. На лодках па Прыпяці — сьпіртовыя напоі, цыгарэты, цукар, муку, крупы, мёд. У конных павозках праз лес — трыкатаж, абутак, мех, галянтарэю.

Беларускія міліцыянты, памежнікі ды супрацоўнікі спэцслужбаў ладзяць у Семяховічах засады. Праз гэтага тутэйшыя жывуць як на вулкане.

## Рамашчанка ўзначаліць менскае «Дынама»?

Ёсьць імавернасьць, што па сканчэньні сэзону ў камандзе, якая праваліла чэмпіянат, адбудзецца чарговая зьмена трэнэра. Сярод кандыдатаў у пераемнікі Аляксандра Хацкевіча найбольшыя шанцы мае 34-гадовы Міраслаў Рамашчанка, які ўзначальвае дублёраў маскоўскага «Спартака».

**Чык; Люд; Буг; паводле «Эўрапейскае радыё для Беларусі», «Звязда», ІА Regnum, BulletinOnline.org**

# Блізкая Бацькаўшчына

Восень у сядзібе Рэйтанаў.
Фотанарыс нашай чытачкі **Ірыны Мірскай**.






**Жыхарка Грушаўкі, спадарыня Ніна.**





**Нутраная аздоба сядзібы: ацалелы дубовы паркет, расьпісаныя ўручную шпалеры.**



Сядзіба Рэйтанаў паціху ператвараецца ў руіны. Без вакон і дзьвярэй стаіць дом, запэцканы бруднымі надпісамі. Разрабавалі ўсё, разабралі нават падлогу і печы. Але хто ведае, можа добрыя людзі ўзялі ўсё гэта сабе на памяць пра славутага сына сваёй Радзімы…

**Поўны тэкст — на сайце radzima.org**

. . . . . . . . . . . . .

Фальварак Грушаўка месьціцца непадалёк ад Ляхавіч, на ўсход, па дарозе да вёскі Перахрэсьце.



**Флігель Тадэвуша Рэйтана.**



**Гумно.**

# «1612» — стэрэатыпы новае Расеі

Расея ў фільме дзікая, абыякавая, здрадлівая. І няздольная існаваць бяз моцнае ўлады — гэта і была палітычная замова Крамля.

Прэзыдэнт Барыс Ельцын адмежаваўся ад кастрычніцкае рэвалюцыі, а яе гадавіну, 7 лістапада, пераназваў у Дзень народнага адзінства. Прэзыдэнт Уладзімер Пуцін адмежаваўся ад эпохі Ельцына, — ўжо цягам двух гадоў расейцаў афіцыйна мусіць яднаць дата 4 лістапада, якая ўвекавечвае паразу польскае інтэрвэнцыі ў 1612 годзе. Каб павароты палітыкі былі зразумелымі нават дзіцяці, Крэмль замовіў мастацкі маніфэст новае Расеі — супэрпрадукт «1612», прызначаны для прагляду ад 12-гадовага веку.

Выканаць замову Крамлю ўзялася студыя «Тры Т» Мікіты Міхалкова. Аднак ляўрэат Оскару, заняты ўласнымі праектамі, застаўся ў ролі прадусара. Рэжысуру даручыў свайму сябру Ўладзімеру Хаціненку («Мусульманін», «Пагібель імпэрыі»). Здымкі карціны паводле сцэнару Арыфа Аліева («Каўкаскі палонны», «Мангол») былі ажыцьцёўленыя за 100 дзён у Маскве, Выбаргу, Празе, Рыме і Беларусі. На прэс-канфэрэнцыі рэжысэр ацаніў бюджэт фільму прыблізна на 12 млн даляраў. І пашкадаваў: «Пры Сталіну нам далі б болей».

Колькі каштаваў фільм напраўду — невядома, ніхто з «Тры Т» не прызнаецца. Адзіна дакладна вядомую суму — каля 4 млн даляраў — склала ахвяраваньне прыватнага спонсара, алігарха Віктара Вексельберга (ён у сваім часе выкупіў для Расеі шэдэўр ювэлірнага мастацтва Фабэржэ, велікоднае яйка царскае сям'і).

Фільм ствараўся ў атмасфэры сапраўднае дзяржаўнае таямніцы. Шэптам гаварылася пра яго антыпольскі характар, тым больш, што антыпатыя да Польшчы сталася ідэалягічным падмуркам імпэрыі Пуціна.

Першы паказ у маскоўскім кінатэатры «Октябрь» разьвеяў боязь ксэнафобскіх ухілаў. Хаціненка зьняў прыгодніцкі фільм з выразным павучальным пасланьнем: разлад руйнуе, згода і праваслаўная вера будуюць айчыну.

Палову 140-хвіліннага фільму займаюць двубоі і бойкі, штурм крэпасьці і сутыкненьні войскаў. Але ад пачатку XVII ст. на Расею нападалі швэды, германцы, а палякі нават аблажылі Крэмль — было з кім і за што ваяваць. Дзея адбываецца па сьмерці Барыса Гадунова (1605 г.), трон займае чарговы самазванец, пасаджаны польскімі магнатамі і часткаю баяраў. Пошум крылаў гусарскага войска ў першай сцэне, надпісы тлумачаць тое, што ня ў стане паказаць камэра : «Прайшлі яшчэ чатыры гады, Русь усё ня мае цэнтралізаванае ўлады».

Дзея фільму сканчаецца напярэдадні выбараў Міхаіла Раманава царом (1613 г.). Гістарычныя асобы, плоскія, бы плякаты, дзеюць на другім пляне: Ілжэдзьмітры ладзіць масьленічныя гуляньні, князь Пажарскі навучае патрыятызму. У цэнтры знаходзіцца гісторыя каханьня сына царскага цесьлі Андрэйкі (Пётар Кіслаў) да дачкі Гадунова Ксені (Віялета Давыдоўская). Гісторыя рамантычная, заснаваная на некалькіх вядомых расейскіх мітах. Андрэйка з бурлакамі цягне карабель, ствараючы кінаўвасабленьне карціны Рэпіна «Бурлакі на Волзе». Годная й самотная Ксеня нагадвае Алёнушку з палатна Васьняцова.

Фабула насычаная цытатамі з гісторыі. Стараверстоўпнік нібыта жыўцом выйшаў з жыцій праваслаўных сьвятых, абарванцы народнага апалчэньня спалучаюць спрыт Івана-дурня з адвагаю чырвонага камандзіра Чапаева. Карацей, расейцам нагадваюць іхныя улюбёныя архетыпы.

Над станам польскіх рубакаў лунае польская мова далёка ня Рэя і Каханоўскага: «Kurwa, kurwa, kurwa mać!». Рэжысэр тлумачыць тое прынцыпам: расейцы таксама не гавораць па-стараславянску (мату, аднак, з экрану не чуваць).

Галоўнага адмоўнага персанажа — паляка, амбітнага гетмана, які марыць пра расейскі трон, зграў Міхал Жаброўскі. Гофманаўскі сымбаль польскага рыцарства ўжо ў першай сцэне забівае маці Андрэйкі. У наступнай ратуе Ксеню, дачку Гадунова. Хоча схіліць прыгажуню да прыняцьця каталіцтва і, стаўшы яе законным мужам, правіць ад Смаленску да Ўралу.

«Парэкамэндаваў Жаброўскага Хаціненку я, тлумачачы, што калі ўжо паляк мусіць быць ліхім, дык няхай будзе, прынамсі, пекным», — Кшыштаф Занусі, знаходзячыся ў Маскве, трапіў на прэм'еру калегі й высока ацаніў гульню Жаброўскага. — «У ягонай інтэрпрэтацыі прыдуманы адмоўны характар вырастае да трагічнае постаці. Адчуваецца, што ён імкнецца да нечага большага, чымся ўлада. Кахае жанчыну, якой ніколі не даб'ецца».

Найстрашнейшы вораг Расеі не бярэ, аднак, у рукі ані шаблі, ані нажа, толькі высылае місіянэра-езуіта. І хаця рэжысэр ганарыцца, што ролю рымскага кардынала згадзіўся зграць Габрыэль Фэрцэці, легендарны актор Антаніёні, у сцэнах зь ягоным удзелам, бадай, не паклапаціліся пра вонкавую паліткарэктнасьць — Рым гэта зло.

Сваіх у фільме таксама не шкадавалі. Сьмельчаку, які зласьліва камэнтуе дзеяньні ўлады, вартавыя адразаюць язык. У сцэне лупцоўкі Андрэйкі прымаюцца заклады, ці перажыве ён экзэкуцыю.

Расея ў фільме дзікая, абыякавая, здрадлівая. Толькі князь Пажарскі здольны пераканаць суайчыньнікаў, што айчына ў небясьпецы. Ізноў жа — без улады, якая навучыць, як жыць, ані руш!

Але навучаны расеец робіцца непераможным. Зробіць гармату з скуры і пацэліць зь яе проста ў парахоўню непрыяцеля. Расейскі спрыт адолее замежную тэхніку.

Фільму гарантаваныя добрыя касавыя зборы. Моцным бокам баевіка сталі таксама дасьціпныя дыялёгі і зоркі, што граюць ролі другога пляну. Аляксандар Балуеў і Даніла Сьпівакоўскі спалучаюць рафінаваную жорсткасьць з шальмоўскім агеньчыкам, Дастаеўскага з Ільфам і Пятровым.



Расейская прэса прыняла фільм з іроніяй. Высьмеяла палітычную замову, намаляваны вобраз улады. Кпяць з сымбалю Расеі — белага аднарога, а матывы фэнтэзі называюць «фасфарэсцыруючым анахранізмам».

**Ад перакладчыка.** Фільм Хаціненкі ўяўляе сабой жывы кантраст зь фільмам Анджэя Вайды «Катынь», прэм'ера якога адбылася ў Польшчы ў мінулым месяцы. Там няма палітычнае замовы, затое ёсьць станоўчыя героі расейцы, што ратуюць героя стужкі. Спроба прымірэньня, працягнутая рука — і спэцыфічны адказ з Масквы. Характэрна, што «1612» дэманструецца ў Менску сынхронна з Масквой, а вось «Катынь», фільм нашмат больш гуманістычны, здаецца, ня мае шанцаў трапіць у беларускі пракат.

**Фільм пераконвае: без улады, якая навучыць, як жыць, ані руш!**

**Пераклала Марына Салавей паводле gazeta.pl**

## ВАЧЫМА КІНАЗНАЎЦЫ

# 1612: Хронікі Смутнага часу

**1612: Хронікі Смутнага часу** (1612: Хроники Смутного времени)

Расея, 2007, каляровы, 175 хв.

**Рэжысэр:** Уладзімер Хаціненка

**Ролі выконваюць:** Пётар Кіслоў, Віялета Давыдоўская, Артур Смальянінаў, Міхаіл Парэчанкаў, Марат Башараў, Габрыэль Фэрцэці, Аляксандар Балуеў, Валер Залатухін

**Жанр:** Гісторыка-фантазійныя прыгоды паводле сцэнару й кнігі Арыфа Аліева

**Адзнака:** 3,5 (з 10)

Хлопчык-халоп Андрэй закахаўся ў царэўну Ксеню Гадунову. У часы бязладзьдзя ён выдае сябе за гішпанскага ідальга, ратуе Ксеню і краіну ад «польска-літоўскіх» акупантаў — і ледзьве ня робіцца царом…

Суседзі спэцыяльна выпусьцілі карціну да 4 лістапада, калі ў Расеі сьвяткуюць правал першае спробы інтэграцыі. Стужка вельмі пасуе да расейскіх выбараў, бо падкрэсьлівае: усе нягоды ў краіне ад таго, што «цара няма».

Стужка мусіла ствараць новы расейскі міт, каб апраўдаць канфрантацыю Расеі з Захадам — і «растлумачыць сэнс новага сьвята». «1612» сьведчыць пра адсутнасьць расейскай міталёгіі — і адсутнасьць для яе грунту.

Замест пагрозьлівага эпасу «пра рускі народ і дрэнных інтэрвэнтаў» (большую частку якіх складалі ліцьвіны) — прышчаваныя падлеткавыя фантазіі на ўзроўні 20-й сэрыі 30-га «Ваўкадава». «1612» крадзе маёмасьць у «Хронік Нарніі», «Царства Нябёснага», «Піратаў Карыбскага мора» — але не ў каня корм.

У кадры дакучліва швэндаецца аднарог, мёртвы гішпанец дае ўрокі, а бялявы старац (Валер Залатухін) — прарочыць ксяндзу-акупанту кепскую будучыню (калі ён не адпусьціць барады й не начэпіць на пуза вялізны крыж).

Стужка спрабуе пагуляць у авантуру (як здараецца ў пачэсных прыгодніцкіх фільмах) — але ўвесь час зьбіваецца на тандэтны дзяржаўніцкі патас, якому сама ня верыць. Уладалюбны рымскі Папа, мудры рускі народ (у асобе прамоўцаў з натоўпу), герой — «бурлак на Волзе», татарын-патрыёт… Ані характараў, ані разьвіцьця — суцэльныя ідэалягічныя клішэ скарагаворкай, вартыя тэленавінаў і Крамлёўскага палацу. Нат няшчасны аднарог — як падкрэсьлівае сайт стужкі — геральдычны знак маскоўскіх уладароў.

З намёкаў на гісторыю — гусары з крыламі (якіх называюць выключна ляхамі), гарматы, забытыя строі — але шматпакутная «Насьця Слуцкая» — на тле карціны «1612» выглядае вяршыняю рэалізму.

Неблагі рэжысэр Хаціненка, аўтар «Макарава» і «Люстэрка для героя», які згадзіўся на заказную халтуру, у фільме адсутнічае. Затое ёсьць патрыятычная студыя «Тры Т» Мікіты Міхалкова. «1612» — гэта студыйны «Стацкі дарадца» для маладзёвай расейскай аўдыторыі. Глямурна-рэклямны, мёртвы й эклектычны.

Фільм употайкі здымаўся ў Беларусі. У масоўках удзельнічалі беларускія месьцічы. Праз трыста гадоў яны адпомсьцілі за сваіх выгнаных з Масквы продкаў, зьняўшыся ў «патрыятычнай» расейскай карціне — настолькі нуднай і нікчэмнай, што глядзець яе немагчыма.

Андрэй Расінскі

## ДЗЯНІС СІДАРОК

АБГОРНУТЫ СЬЦЯГАМ

Сорамна...
карыстацца паўсюль чужынскаю моваю,
Сорамна...
не знаходзіць замены ёй беларускімі словамі,
Сорамна...
глядзець тэлевізар і слухаць радыё,
Гора там, дзе пануе страх і апатыя,
Значыць, гора нам.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Падчас «Сацыяльнага маршу» моладзь выйшла на пляц Незалежнасьці.**

Цяжка мне...
халоднай крывёй абліваецца сэрца,
Цяжка мне...
ў краіне сваёй сабе не знаходжу месца,
Ў радзіме маёй чужынцы цяпер уладараць,
Няма аб чым тут зараз больш марыць,
Ня мае сэнсу увогуле марыць.

Кепска мне, калі чую афіцыйныя дадзеныя,
Што ўсё добра, выдатна — «дзякуй уладзе»;
Ў краіне мір, спакой і верацярпімасьць,
Толькі чамусьці баліць галава — актыўнасьць
Сонца падвышаная — гавораць сыноптыкі,
Ня трэба быць спэцыялістам па оптыцы,
Каб бачыць, што ўсё ня так.

Іншыя вераць, лічаць, што пройдзе
Празь некалькі год, а мо і стагодзьдзяў,
Ды толькі як тады Беларусь будзе звацца?
Русіфікатараў плённая праца
Ідзе паскораным тэмпам.

Стаю, абгорнуты бел-чырвона-белым сьцягам,
Гляджу на блакіт неба, аблокі зыгзагам
І думаю, што ўсё, усё безнадзейна,
Ах, калі б хоць раз памыліцца, чарговая дзея
У драме гісторыі...

Сорамна, што гэткія думкі я маю,
Сорамна, што мне бракуе моцы змагацца,
Цяжка мне, але сьцяг мае раны хавае,
І ведаю — наперадзе пляцы,
Наперадзе воля.

## ГАННА ЯНОЎСКАЯ.

* * *

Яблыкі! Божа мой, колькі! Затоплена месца
Па косткі, па колы, затоплена нават вакно.
Тут яблыні вечныя, яблыкі — сонца і месяц.
І тут у калюжах стаіць не вада, а віно.
Хоць стань на калені ды пі... Мы былі тут калісьці.
Ну вось жа і плямы на вопратцы не ад вады.
Тут зноў прарастаюцца дрэвы — у сходы і выйсьці,
Тут з дахаў ссыпаюцца сьпелыя сокам плады.
Спачатку быў сад. А будынкі зьявіліся потым.
З-за іх пазіраюць, сьмяюцца нам дамавікі.
І яблыкі-кулі заселі па рэдзенькім плоце,
А сьвет, як адвечна, чакае жывое рукі.
А яблыкі... Зьмей нам збрахаў, ён ня быў тут, у садзе.
Там дзесьці, пад лісьцем яго засталася нара...
Як мы ж уцякалі тады па таемнай парадзе!
А толькі дагэтуль ня ведаем зла і дабра.
Ты помніш, чаго не шукаюць, таго не бароняць.
Бо людзі мяркуюць, што ўсё ўжо адкрылі да іх.
Дык колькі ж нам дрэў абысьці, каб знайсьці забарону?
І колькі нам стужак наплесьці, пазначыць усіх?

*Пераклаў з украінскай А. Бацюкоў.*

# Гульня-складанка

## Выражы простакутнікі і складзі зь іх карцінку!



Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org

# «Менск. Горад СОНца» ў Парыжы ды Брусэлі

**Артур Клінаў** знаёміць са сваім новым раманам францускую і бэльгійскую сталіцы.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Раман Артура Клінава «Менск. Горад СОНца» працягвае пераможнае шэсьце па Эўропе. Прэзэнтацыі кнігі з удзелам аўтара адбудуцца 7 лістапада ў Парыжы і 12 лістапада ў Брусэлі з ініцыятывы «Офісу за дэмакратычную Беларусь» (Брусэль) і асацыяцыі Belprojet (Парыж).

Артур Клінаў — беларускі мастак, фатограф і пісьменьнік, выдавец часопісу «pARTisan». Ягоны раман — арыгінальнае філязофскае пераасэнсаваньне. Паводле Артура Клінава, Менск — гэта мара, якая зрабілася рэальнасьцю, прывідны Горад Сонца ў Краіне Шчасьця, брама ў краіну Ўтопію, якая так і не была пабудаваная.

У 2006 г. выдавецтва «Логвінаў» выдала фотаальбом Артура Клінава «Горад СОНца». Кнігай зацікавілася нямецкае выдавецтва «Suhrkamp». У выніку, фотапраект перарос у раман, які быў выдадзены па-нямецку ў 2006. Цяпер «Менск. Горад СОНца» робіць першыя крокі да англа- і франкамоўнага чытача. Публіцы будуць прадстаўленыя ангельскі і францускі пераклады абраных разьдзелаў кнігі.

Па-беларуску раман неўзабаве мае зьявіцца ў сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва».

### Парыж

Прэзэнтацыя раману ў Парыжы распачне месяц беларускай культуры ў францускай сталіцы. Чытаньні з удзелам Клінава і адкрыцьцё фотавыставы аўтара адбудуцца 7 лістапада ў 19.00. Месца правядзеньня — культурны цэнтар Maison d'Europe et d'Orient (3 passage Hennel, 75012 Paris). Дадатковую інфармацыю пра месяц беларускай культуры можна атрымаць па адрасе belprojet.asso@gmail.com

### Брусэль

У Брусэлі Клінаў прэзэнтуе выбраныя разьдзелы сваёй кнігі ў перакладзе на ангельскую мову. Таксама будзе дэманстравацца слайд-шоў фатаздымкаў аўтара. Імпрэза адбудзецца 12 лістапада ў 19:00. Месца правядзеньня — Hanse Office (прадстаўніцтва Гамбургу і фэдэральнай зямлі Шлезьвіг Гольштайн у ЭС). Адрас: Avenue Palmerston 20 B 1000 Brussels. Зарэгістравацца да ўдзелу і атрымаць дадатковую інфармацыю пра імпрэзу можна праз пошту info@democraticbelarus.eu



## 10 лістапада Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч урачыста заступіць на пасаду

У суботу 10 лістапада адбудзецца цырымонія ўрачыстага ўваходу ў менскую архікатэдру новапрызначанага арцыбіскупа Мітрапаліта Менска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча.

Урачыстасьць пачнецца аб 11-й у Катэдральным саборы, што на плошчы Свабоды. На цырымонію запрошаныя госьці зь Беларусі, Італіі, Літвы, Польшчы, Расеі. Катэдра, пэўна, ня зьмесьціць усіх. Таму на вуліцы будзе ўсталяваны адмысловы экран.

Падчас урачыстасьці мітрапаліт Кандрусевіч адслужыць літургію ды прачытае казань.

**Сямён Печанко**

**Тадэвуш Кандрусевіч**

нарадзіўся ў 1946 г. у Адэльску на Гарадзеншчыне. Скончыў Ленінградзкі політэхнічны інстытут. 31 траўня 1981 г., па сканчэньні Ковенскай духоўнай сэмінарыі, рукапакладзены ў сьвятары. Абараніў доктарскую дысэртацыю «Самасьвядомасьць Царквы» паводле дакумэнтаў II Ватыканскага сабору.

З 1988 г. у Беларусі. 10 траўня 1989 г. прызначаны біскупам для Менскай дыяцэзіі. У красавіку 1991 г. прызначаны Апостальскім адміністратарам для каталікоў лацінскага абраду поўначы Эўрапейскай часткі Расеі. У сакавіку 1999 г. выбраны Старшынём Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў Расеі, а ў лютым 2002 г. прызначаны мітрапалітам наваствораных рымска-каталіцкіх япархіяў Расеі. Ад 10 лістапада — арцыбіскуп Мітрапаліт Менска-Магілёўскі.




## КАНЦЭРТ

**Джаз**

**19 лістапада ў Вялікай канцэртнай залі Белдзяржфілярмоніі** адбудзецца канцэрт францускага джазавага гурту **OZMA**, уладальніка Гран–Пры–2006 за аркестравае выкананьне на нацыянальным конкурсе «Jazz a la Defense». Самыя музыкі характарызуюць стыль свайго выкананьня як «мэтрычна–рытмічны, сьвінгава–сьвяточна–цёплы, дынамічна–шурпаты, гітарна–саксафонна–трамбонна–ўдарны джаз».

## ТЭАТРЫ

**опэра**

*на сцэне ЦДА*

**15 (чц)** — «Баль–маскарад».

**Купалаўскі тэатар**

**11 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».
**12 (пн)** — «Памінальная малітва».
**14 (ср)** — «Вольга».
**15 (чц)** — «Вечар».
**16 (пт)** — «Смак яблыка».
**17 (сб)** — «Паўлінка».
**18 (ндз)** — «Макбэт».

*ранішя спэктаклі*

**11 (ндз)** — «Паўлінка».
**18 (ндз)** — «Сьнежная каралева»..

*малая сцэна*

**15 (чц)** — «Апэльсінавае віно».
**17 (сб)** — «Варшаўская мэлёдыя».

**Тэатар юнага гледача**

**10 (сб)** — «Прыгоды Бібігона».
**10 (сб)** — «Апошняя дуэль».
**10 (сб)** — «Паліяна».
**11(ндз)** — «Папялушка».
**11 (ндз)** — «Бармалей».
**13 (аўт)** — «Тая, што стварыла цуд».
**14 (ср)** — «Рыцар Ордэна Сонца».
**15 (чц)** — «Мятлік».
**16 (пт)** — «Таямніцы блакітных азёраў».
**17 (сб)** — «Маленькія трагедыі».
**17 (сб)** — «Залатое сэрцайка».
**17 (сб)** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**18 (ндз)** — «Мешчанін у шляхецтве».
**18 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**9 (пт), 14 (ср)** — «Адэль».
**10 (сб)** — «Казачкі з куфэрачку».
**10 (сб), 17 (сб)** — «Сталіца Эраўнд».
**11 (ндз)** — «Сёстры Псіхеі».
**13 (аўт)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**15 (чц)** — «Палёты з анёлам».
**16 (пт)** — «Нязваны госьць».
**17 (сб)** — «Дамавічкі».
**18 (ндз)** — «Шлях у Царград».

## ІМПРЭЗЫ

**Прэзэнтацыя кнігі Сяргей Грахоўскага**

Літаратурны вечар **«Калі душа заходзілася болем»** прысьвячаецца выдатнаму пісьменьніку, паэту Сяргею Грахоўскаму (1913—2002) з прэзэнтацыяй яго кнігі «Выбраныя творы», выдадзенай у сэрыі «Беларускі кнігазбор». У праграме ўспаміны родных і сяброў, выступленьні паэтаў, музыкаў. Прагучаць вершы С.Грахоўскага і іншых творцаў. Вечарына адбудзецца **14 кастрычніка ў Менскім міжнародным адукацыйным цэнтры (пр-т газэты «Праўда», 11). Пачатак а 19-й.** Вядучая Вольга Іпатава.

## ВЫСТАВЫ

**Выстава гістарычнага партрэту**

**У чытальнай зале бібліятэкі журфаку БДУ (вул. Маскоўская, 15) да пачатку сьнежня** працуе выстава гістарычнага партрэту. У экспазыцыі 25 партрэтаў гістарычных палітычных і культурніцкіх дзеячаў Беларусі — Эўфрасіньня Полацкая, Барбара Радзівіл, Мікола Гусоўскі, Іван Луцкевіч і іншыя.

**Час гульні. Тэхна-арт**

**Ад 2 да 13 лістапада мастацкая галерэя «Ўнівэрсытэт культуры»** прэзэнтуе дасягненьні беларускага Тэхна–арту. Сёлета «сваю гульню» прадстаўляюць Уладзімер Цэсьлер, Вадзім Качан, Андрэй Шчукін, Уладзімер Парфянок, Даніїл Парнюк, Аркадзь Бірылка, Аляксандар Шчэпетаў, Сяргей Стэльмашонак. Таксама «гуляюць у Тэхна–арт» маладыя мастакі: Сяргей Ждановіч, Алена Таборка, Тацяна Гомза, Кацярына Марціновіч, Дзяніс Барсукоў, Марыя Пятровіч…

На выставе будуць прадстаўленыя работы ў наступных напрамках: 3D–анімацыя, кампутарная графіка, лічбавы мантаж, арт–аб'екты.

# Блізкая Бацькаўшчына



**Восень у сядзібе Рэйтанаў. Фотанарыс нашай чытачкі Ірыны Мірскай. Старонка 24.**

## СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З Гродзеншчыны.** 24 лістапада ад гарадзенскага губэрнатара выехаў чыноўнік «асобых паручэній» рабіць рэвізію ў народных бібліятэках Бельскага пав. (у в. Шчытах, Кленіках і Дубічах–Царкоўных), Берасьцейскага пав. (у в.Астрамечава) і Кобрынскага пав. (у в.Крупчыцы). Рэвізія рабілася пасьля даносаў людзей, каторым не спадабалася праца дзеля прасьвятленьня народа. Чыноўнік, разглядзеўшы сьпіскі кніжок, прызнаў, што кніжкі Дастаеўскага, Талстога, Караленкі (хаця ўсе дазволены цэнзурай) не павінны быць ў бібліятэках для народу; заведуючых бібліятэкамі пастрашыў, што іх пакараюць за тыя кніжкі.

**Nemo**

**«Наша Ніва». №35. 1907**




# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Вельмішаноўнага ксяндза** Юр'я Барка віншуем з 35–годзьдзем, зычым усялякага плёну на жыцьцёвай дарозе! Сяргей Ушакоў

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** «Кракаў і замкі» 30 лістапада—3 сьнежня. Т. 292–54–58; GSM 622–57–20; 509–12–16; 110–19–28

### КАНТАКТЫ

Чытачы «Нашай Нівы» зь Віцебскай вобласьці! Далучайцеся да дзейнасьці партыі БНФ! Канстанцін Смолікаў. Т.: 118–92–38

### ДАВЕДНІК

**Падрыхтаваны энцыкляпэдычны даведнік** «Рэпрэсаваныя мэдыкі». Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753–82–12, 755–25–61, (017) 211–09–53. Леанід Маракоў

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: М.Раманюк «Беларускае народнае адзеньне», Ластоўскі «Расійска–Крыўскі (беларускі) слоўнік» 1924, Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска–расейскі слоўнік» 1926, Л.Геніюш «Споведзь», «Беларускі кнігазбор»: Чачот, Жылка, Каліноўскі, Баршчэўскі, Міцкевіч, Гётэ, Летапісы і хронікі ды іншае. Т.: 753–70–05

**Запрашаем на выставу** беларускай кнігі і музыкі на сядзібу ТБМ па вул. Румянцава, 13 у будні з 14 да 18.

**Інфармацыя**. Абмен інфармацыйнымі матэрыяламі, літаратурныя вечарыны, выставы, выдавецкія праекты. alesknigi@mail.ru

**Шукаю кнігі**, прысьвечаныя пэрыяду Вялікай айчыннай вайны «Іх імёнамі названыя вуліцы» і іншыя, збор твораў Купалы, Коласа, Бядулі, Броўкі (50–я гады). Т.: 753–91–96. alesknigi@mail.ru

## КАЛІ Б...

**...дзяржава пасьлядоўна змагалася з муміямі. Бо напярэдадні Хэлоўіну ў Менску былі затрыманыя і асуджаныя людзі, апранутыя ў касьцюмы мумій.**




**Даўгалёў, амбасадар РБ у Расеі:** Я патрабую нарэшце прыпыніць гэтую антыбеларускую правакацыю.

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## ЖАРТ

А ну марш на марш супраць адмены льготаў! — сказаў унук-рыэлтэр сваёй бабулі-пэнсіянэрцы.

**Чуб**

## МОВА—2007

### Тапелец топіць печку

Лукашэнкаўская газэта «Рэспубліка» думае, што слова «тапелец» азначае чалавека, які паліць у печы. «Лесаруб выратаваў тапельца» — так называецца артыкул пра здарэньне на пажары ў Бялыніцкім раёне. «Тапельцам» па-беларуску называюць таго, хто патануў, а таго, хто пагарэў — «пагарэльцам».

**Кар**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

засноўваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.11.2007.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.